Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 8 1934 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 6 (4839)

Год выдання XVII

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

СОЦСПАБОРНІЦТВА НА ВЫКАНАННЕ ФІНПЛАНА

СМАЛЕНСК. (Па тэлеграфу ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

1-2 студзеня ў г. Смаленску адбыўся V тыраж выйгрышаў пазыкі чацвертага завяршаючага года першай пяцігодкі.

Усяго ў тыражы было разыграна 400 тысяч выйгрышаў па суму ў 42.489.600 рублёў.

Тыраж прайшоў з вялікім уздымам. З прывітаннямі і рапартамі выступалі дэлегацыі прадпрыемстваў, соўгасаў і калгасаў Заходняй вобласці, а таксама дэлегацыі ад БССР, ЦЧВ і інш.

Пасля тыража адбыўся злёт ударнікаў фінфронта. Злёт падагуліў папярэднія вынікі соцыялістычнага спаборніцтва па фінансавай рабоце паміж Заходняй вобласцю і БССР у 1933 г. На злёце-ж быў заключан новы соцыялістычны дагавор на 1934 год. Падпісанне дагавора дэлегацыямі Заходняй вобласці і БССР адбывалася 4-га студзеня.

Арбітрам спаборніцтва выбраны Народны Камісарыят Фінансаў Саюза ССР, Цэнтральны камітэт саюза фінбанкаўскіх работнікаў і газета «Экономическая жизнь».

Павысіць тэмпы і палепшыць якасць рамонта трактараў

Рамонт трактараў — адказнейшы ўчастак падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Для таго каб забяспечыць паспяховы ход выканання плана веснавой сяўбы, для таго каб у 1934 годзе дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю і далейшага руху па шляху да калгаснай заможнасці, трэба, перш за ўсё, своечасова і добраякасна адрамантаваць трактары.

Паводле апошніх даных Наркамзема рамонт трактараў па БССР разгортваецца злачынна марудна. На 30 снежня па МТС адрамантавана толькі 249 трактараў — 15,4 проц. Па МТМ прырост за апошнюю пяцідзеўку складае ўсяго 6,9 проц. Рад МТМ — ГОМЕЛЬСКАЯ, ГАРАДОЦКАЯ, ЛЕПЕЛЬСКАЯ, АРШАНСКАЯ — за апошнія пяць дзён не адрамантавалі ніводнага трактара.

Больш за ўсё адстае ІЛЬНАТРАКТАРАЦЭНТР, які выканаў усяго 10 проц. плана рамонта. Большасць МТС Ільнатрактарацэнтра за апошнюю пяцідзеўку снежня не адрамантавалі ні аднаго трактара.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што многія МТМ і МТС вельмі дрэнна рыхтуюць трактарны парк да вясны. Сапраўдны большэвіцкай трывогі за лёс трактарнага парка, настойлівай барацьбы за своечасовы і добраякасны рамонт трактараў усё яшчэ няма.

Рамонтныя майстэрні, заводы і гаспадарчыя арганізацыі ў апраўдан не нізкіх тэмпаў рамонта спасылаюцца на недахват запасных частак. Сапраўды, недахват запасных частак поўнасцю яшчэ не зжыт. Але ці толькі ў запасных частках справа, ці толькі яны перашкаджаюць узмацніць тэмпы?

У сапраўднасці-ж галоўная прычына з адгаваннем рамонта трактараў хаваецца ў выключна дрэнным арганізацыі працы ў майстэрнях.

Узяць хоць-бы да прыкладу ЛЕПЕЛЬСКУЮ МТМ, якая абсталявана добрымі верштатамі і мае дастатковую колькасць запасных частак. За апошнія пяць дзён Лепельская МТМ не адрамантавала ні аднаго трактара і ні аднаго матора. План рамонта выкананы усяго на 25,2 проц. Ды інакш і не магло быць пры той абязпечанасці і бездапаможнасці, якая пануе ў майстэрні. Тут нават няма элементарных правіл унутранага распарадка. Працоўная дысцыпліна на вельмі нізкай ступені. Рабочыя прыходзяць і ўходзяць калі ім уздумаецца. Адна брыгада цягне ў другой лепшыя часткі, дэталі аднаго матора трапляюць да другога. Даходзіць да таго, што з майстэрні раскрадаюцца інструменты. Дырэктар майстэрні ЛАМАЧЫНСКІ на ўсё гэта глядзіць скрозь пальцы, толькі таму, што «ён баіцца астацца без людзей». Бракаробы пагодна адчуваюць сябе ў Лепельскай МТМ, бо там няма бракеража і тэхнічнага кантролю.

Ёсць у Лепельскай МТМ і добрыя брыгады — Ягора Вашука і Еўдакіма Арцюха. Гэтыя брыгады паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы работы, выконваюць заданні. У іх амаль няма браку. Але вопыт і практыка гэтых ударных брыгад нікім не вывучаецца, не перадаецца іншым рабочым. Ударнік не заняў цэнтральнае месца ў майстэрні.

Найбольш характарным прыкладам няўмення правільна скарыстаць абсталяванне і рабочую сілу з'яўляецца ДЗЯРЖЫНСКАЯ МТМ. За тры месяцы майстэрня адрамантавала ўсяго 18 трактараў і матораў, план выканан на 11 проц. Увесь цяжар рамонта тут выпадае на студзень і люты. Напружаная работа патрабуе зараз высокай аперацыйнасці адміністрацыйна-тэхнічнага персанала. На справе гэтага няма. 75 проц. прымацаваных да гэтай МТМ трактараў — гэта марак «ХТЗ» і «ФП». Запаснымі часткамі да гэтых трактараў МТМ забяспечана. Але, замест рамонта трактараў, «ХТЗ» і «ФП» тут разбіраюць «Джон Дэры», да якіх пакуль няма запасных частак, завальваюць імі ўсе памяшканні і дэзарганізуюць усю работу. Механік ЖМЕРЫНС займаецца чым толькі хочаце, але толькі не арганізацыяй рамонта, у выніку брыгады не атрымліваюць аперацыйных заданняў. Ахова майстэрні арганізавана так, што любы можа прыйсці і расцягнуць дэталі і запасныя часткі. Са двара майстэрні ўжо растягнулі дзесяткі метраў дроў. Дырэктар Гапавач не адчуваў адказнасці, якую ўскладзілі на яго партыя і ўрад. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое становішча, якое стварылася ў майстэрні.

Поўную бездапаможнасць праяўляе і дырэкцыя СЕННЕНСКАЙ МТМ. Летась трактары Сеннескай МТС рамантаваліся так, што вясной яны нават не даходзілі да месца работы. Іх прышлося цягнуць назад на паўторны рамонт. Аднак, урокі мінулага года не ўлічаны цяперашнім кіраўніцтвам майстэрні (дырэктар БАГУШЭЎСКІ). Майстэрня дагэтуль не зашклена, запасныя часткі раскіданы кучамі, у майстэрні бруд, рамонт праходзіць без усякага тэхнічнага кантроля. Вось чаму план выканан ўсяго на 11,8 проц.

Практыка Дзяржынскай і Лепельскай МТМ характарны для многіх іншых. Нельга не спыніцца і на адсталай рабоце некаторых цэнтральных арганізацый, якія забяспечваюць майстэрні запаснымі часткамі і матэрыяламі. СНАБРАМОНТАМ (дырэктар Буднік) былі заключаны дагаворы з металазаводамі БССР на выраб такіх частак, як поршні і пальцы. Але, з прычыны несвоечасовай прысылкі заводам рабочых чарцяжоў да дэталяў, выпуск апошніх затрымаўся амаль на месяц.

8 снежня Снабрамонтам быў закуплен у Ленінградзе вагон патрэбнай сталі. Па віне Снабрамонта, які марудзіў з пераводам грошай, адпраўка сталі заводам зацягнулася таксама на месяц.

Мы наглядаем рад фактаў засылкі МТМ некамплектных частак. Так, у апошнія дні склад Снабрамонта разаслаў месцам падшыпнікі пярэдніх капёс трактара «Інтэрна» 10/20 як падшыпнікі для трактараў «ХТЗ». На месцах яны не могуць быць скарыстаны. У гэты-ж самы час у многіх МТС такіх падшыпнікаў не хапае.

Вінаватыя ў засылцы некамплектных частак павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасці.

Асабліва трэба папярэдзіць работнікаў МТС і МТМ аб суровай адказнасці за якасць. Калі паводле пастановы ўрада за выпуск недобраякаснай прадукцыі дырэктары прамысловых прадпрыемстваў адказваюць перад судом, пры чым у якасці меры рэпрэсіі ўстаноўлена не менш 5 год турмы, то гэта цапкам трэба аднесці да такіх прадпрыемстваў як МТМ, ад якасці прадукцыі якіх у значнай меры залежыць поспех веснавой сяўбы.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР НАДАЮЧЫ ВЯЛІКАЕ ЗНАЧЭННЕ СВАЯЧАСОВАМУ І ДОБРАЯКАСНАМУ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ВЫКЛІКАЛІ НА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА АБКОМЫ, АБЛВЫКАНКОМЫ ЛЕНІНГРАДСКАЙ, ЗАХОДНЯЙ, ІВАНАЎСКАЙ І ЧАРНІГАЎСКАЙ АБЛАСЦЕЙ, ЦК КП(б)Б І СНК БССР АБВЯСЦІЛІ ДА XVII З'ЕЗДА ПАРТЫІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ МТМ І МТС, З ТЫМ КАБ РАЗГАРНУЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЯК ПАМІЖ МТМ І МТС, ТАК І ЎНУТРЫ ІХ ПА МІЖ БРЫГАДАМІ І ПААСОБНЫМІ РАБОЧЫМІ.

Своячасовы, высокаякасны рамонт і падрыхтоўка трактарнага парка і ўсяго прычэпнага інвентара для веснавой сяўбы павінна зараз стаць першаступеннай задачай усіх большэвіцкіх рабочых і калгаснікаў БССР. Вакоп спаборніцтва на лепшую МТМ і МТС трэба ўзняць актыўнасць рабочых рамонтнікаў і трактарыстаў.

МТС і МТМ БССР маюць усе магчымасці для таго, каб своечасова і добраякасна закончыць рамонт. Ліст рабочых ударнікаў ГАРАДОЦКАЙ МТМ, які мы сёння друкуем, з'яўляецца лепшым пацвярджэннем гэтага.

— Мы можам выконваць заданні партыі і ўрада ў тэрмін. Трэба толькі захацець і правільна арганізаваць працу, — так пішуць рабочыя Гарадоцкай МТМ. І сапраўды, за кароткі час Гарадоцкая МТМ дабілася значных поспехаў. Палітаддзел дапамог МТМ правільна расставіць свае сілы, распрацаваць вытворчы план, давесці заданні да кожнай брыгады, устанавіць цвёрды, непарушны графік рамонта і жалезную працоўную дысцыпліну. Вось што забяспечыла зрух у рабоце Гарадоцкай МТМ.

Ударнікі Гарадоцкай МТМ абязваліся да XVII з'езда ВКП(б) адрамантаваць 105 матораў, г. зн. поўнасцю выканаць сваю праграму. Яны выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва ГОРАЦКУЮ і ЛЕПЕЛЬСКУЮ МТМ.

Пачын Гарадоцкай МТМ павінны зараз падхапіць усе МТМ і МТС БССР. Палітаддзелы, партарганізацыі і раённы друк павінны разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва ў кожнай майстэрні, у кожным цэху, паміж рамонтнымі брыгадамі за лепшую падрыхтоўку трактарнага парка, за гонар быць зачэсным на чырвоную дошку імя XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б).

РАБОЧЫЯ, ТРАКТАРЫСТЫ, БРЫГАДЫРЫ, МЕХАНІКІ, КОМУНІСТЫ І КОМСАМОЛЬЦЫ, РАПАРТУЙЦЕ ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ ЗЛАРОВЫМІ ДОБРААДРАМАНТАВАНЫМІ ТРАКТАРАМІ.

Аб уключэнні ва ўсесаюзны сталінскі паход за павялічэнне сырцовых рэсурсаў лёгкай і харчовай прамысловасці

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б, СНК БССР і Палітсектар МТС вітаюць ініцыятыву Узбекістана па арганізацыі ў гонар XVII з'езда ВКП(б) усесаюзнага сталінскага пахода за павялічэнне сырцовых рэсурсаў лёгкай і харчовай прамысловасці, і абяшчаюць аб уступленні БССР у паход.

2. БССР, з'яўляючыся адным з ільняных і бульбяных раёнаў Савецкага Саюза, лічыць галоўнай задачай свайго ўдзела ў сталінскім паходзе: павялічэнне ўраджайнасці ільнавалакна, пянькі і бульбы на аснове разгортвання масавага спаборніцтва ўсіх ільняных і бульбяных раёнаў, сельсоветаў, калгасаў і соўгасаў рэспублікі з тым, каб у 1934 г. дабіцца рашучых рэзультатаў у павышэнні ўраджайнасці гэтых культур, павялічыць сырцовыя рэсурсы Савецкага Саюза, і тым самым уключыцца ў актыўную барацьбу за рэалізацыю ўказанняў правадыра партыі т. Сталіна аб падвазенні, патраенні выраба прадметаў шырокага спажывання.

3. Прапанаваць рэдакцыі «ЗВЯЗДЫ» ўключыцца ў паход і шырока разгарнуць на сваіх старонках ход разгортвання пахода.

4. Даручыць Наркамзему т. БЕНЕКУ, палітсектару МТС—т. РАТНЕКУ і агітмасу ЦК—т. ПЫЖЫКАВУ распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па разгортванню пахода і прадставіць у трохдзённы тэрмін на зацвярджэнне ЦК.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

ЦК ВКП(б)—ТАВ. СТАЛІНУ

Арганізатару і кіраўніку гераічных і небывалых у гісторыі перамог, руллівому магутнай соцыялістычнай краіны — СССР, выпрабаванаму правадыру сусветнага пролетарыята і нашай слаўнай ленінскай партыі генеральнаму сакратару Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) тав. **СТАЛІНУ** партканферэнцыя Старобінская раёна шле палкае большэвіцкае прывітанне.

Пад тваім выпрабаваным кіраўніцтвам, тав. Сталін, працоўныя нашага раёна, які знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным светам, як і шматмільённыя масы працоўных усяго вялікага неабдымнага Совецкага Саюза, з поспехам змагаюцца за выкананне планаў другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Твае ўказанні аб тым, што наша бліжэйшая задача — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі, стала баявой праграмай практычнай работы ўсёй парторганізацыі раёна. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б), на чале з табой, тав. Сталін, мы і ў далейшым будзем цвёрда і рашуча змагацца за чыстату і жалезнае адзінства большэвіцкіх радоў, за ленінскую нацыянальную палітыку партыі, за перамогу соцыялізма ў другой пяцігодцы.

Няхай жыве большэвіцкая партыя і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве любімы правадыр партыі і рабочага класа ўсяго света тав. **СТАЛІН!**

РАЙПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯ СТАРОБІНШЧЫНЫ.

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

4-я райпартканферэнцыя Барысаўшчыны, пачаўшы сваю работу, шле прывітанне ЦК КП(б)Б і яго стойкаму кіраўніку, непахіснаму большэвіку тав. ГІКАЛО.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выконваючы гістарычныя ўказанні правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНА, Барысаўшчына вышла ў рады перадавых раёнаў БССР і замацавала свае чырвонасцяжныя месца.

У нашых перамогах вялікую ролю адыгралі твае, тав. ГІКАЛО, непасрэдныя ўказанні, твая жалезная воля да рашучага скрушэння элементаў сямейнасці, групоўшчыны, замаслітнасць і згуртаванасць радоў КП(б)Б вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і на непрымірымую барацьбу за генеральную лінію партыі на два фронты — супроць правага ўхіла, як галоўнай небяспекі на даным этапе, «левых» апартуністаў і прымірэнцтва да гэтых ухілаў.

Райпартканферэнцыя запэўняе цябе, тав. Гікало, што Барысаўская партарганізацыя і наделей будзе ў першых радах барацьбы за ажыццяўленне задач другога года другой пяцігодкі.

Пад сцягам Леніна, яшчэ мацней згуртаваўшы свае рады вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і пад яго непасрэдным кіраўніцтвам, наперад да новых перамог — да пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Няхай жыве геніяльны і любімы правадыр партыі і сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІН!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з большэвіцкім кіраўніком ленінцам тав. ГІКАЛО!

Няхай жыве перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі!

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БОЛЬШЭВІКОЎ БЕЛАРУСІ

Смалявіцкая 3-я раённая партыйная канферэнцыя шле палкае прывітанне ЦК КП(б)Б і яе кіраўніку — выпрабаванаму большэвіку-ленінцу т. ГІКАЛО.

Раён датэрмінова выканаў план паставак хлеба і бульбы. Мясапастаўкі на 25 снежня 1933 года выкананы на 100 проц. План асенняй сяўбы выканан на 101 проц., загатоўкі ільнавалакна — на 87 проц.

Даем большэвіцкае абяцанне, што ў бліжэйшыя дні большэвікі Смалявіччыны закончаць на ўсе 100 проц. план ільназагатовак і арганізуюць большэвіцкую падрыхтоўку да 4-ай большэвіцкай веснавой сяўбы.

Чыстка радоў КП(б)Б і нашай раённай партыйнай арганізацыі яшчэ больш павысіла баяздольнасць яе радоў. У напружанай барацьбе за генеральную лінію нашай партыі, супроць апартуністаў усіх масцей, за ленінскую нацыянальную палітыку, супроць нацыяналізма і шавінізма — рады КП(б)Б яшчэ больш ідэйна ўмацаваліся і згуртаваліся.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б пры пастаянным уважэ і дапамозе ЦК ВКП(б) і ўсяго Совецкага Саюза нанесен рашучы ўдар месніцтву, групоўшчыне, дробна-буржуазнай расхлябанасці, апілуйству, дэкларацыйным адносінам да даручаемай партыяй справы.

Большэвікі Смалявіцкага раёна ад імя яе 3-ай раённай партыйнай канферэнцыі запэўняюць ЦК і т. ГІКАЛО, што ў барацьбе за генеральную лінію нашай партыі, у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за заможнае і культурнае жыццё калгаснікаў, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыяналізма — гэтай галоўнай небяспекі на даным этапе на ўмовах Беларусі, супроць вялікадзяржаўнага шавінізма, Смалявіцкая арганізацыя будзе ўзорным атрадам КП(б)Б і з усёй большэвіцкай рашучасцю і настойлівасцю будзе змагацца за пераможнае ажыццяўленне вялікіх задач другой пяцігодкі.

Няхай жыве сталёвае адзінства ленінскіх радоў!

Няхай жыве ВКП(б) і яе геніяльнейшы правадыр т. СТАЛІН!

Няхай жыве КП(б)Б і выпрабаваны большэвік-ленінец тав. ГІКАЛО!

„ЗВЯЗДЗЕ"

Райпартканферэнцыя большэвікоў Барысаўшчыны шле цэнтральнаму органу КП(б)Б — «Звяздзе» большэвіцкае прывітанне.

«Звязда» сваім вастрыём большэвіцкай крытыкі, яе не гледзячы на асобы, выкрывала і выкрывае недахопы нашай работы, бязлітосна змагаецца і змагаецца за перамогу соцыялістычнага будаўніцтва.

«Звязда» была і ёсць магутны арганізатар, агітатар і прапагандыст у барацьбе за адзінства, згуртаванасць нашых радоў вакол генеральнай лініі партыі, у барацьбе за пролетарскі інтэрнацыянелізм, за прынцыпы ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Большэвікі Барысаўшчыны, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б з тав. ГІКАЛО, прышлі да сваёй IV райпартканферэнцыі з радом перамог. З поспехам скончыўшы першы год другой пяцігодкі, датэрмінова выканаўшы здачу хлеба і бульбы дзяржаве і адгрузку бульбы пролетарыяту Ленінграда, — наш раён змацаваў сваё чырвонасцяжнае месца ў радах перадавых раёнаў БССР.

Барысаўская партарганізацыя і наделей будзе змагацца за ажыццяўленне баявой праграмы, вызначанай у тэзісах ЦК ВКП(б) да XVII партз'езда, у барацьбе за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

Няхай жыве ВКП(б) на чале з любімым правадыром сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНЫМ!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО!

Няхай жыве ЦО КП(б)Б — «ЗВЯЗДА»!

***

Атрыманы прывітальны тэлеграмы ЦК КП(б)Б, тав. ГІКАЛО і «ЗВЯЗДЗЕ» ад Клічаўскай, Уздзенскай, Терахоўскай, Старобінскай, Жыткавіцкай і Лагойскай партканферэнцый.

БАРЫСАЎ

6 студзеня на барысаўскую раённую партканферэнцыю прыбылі т. т. **Шаранговіч** і **Картукоў**. На вячэрнім пасяджэнні т. Шаранговіч выступіў з вялікай прамовай, прысвечанай чарговым задачам партыйнай арганізацыі. Тав. Шаранговіч звярнуў асабліва вялікую ўвагу канферэнцыі на выключна важным і практычным значэнні тэзісаў да 17 з'езда ВКП(б).

Партканферэнцыя па дакладу т. **Коніка** аб рабоце ЦК КП(б)Б прыняла пастанову, у першым пункце якой ухвалена палітычную лінію ЦК і работу лічыць адавальняючай.

7 студзеня канферэнцыя звярнулася з лістом да магілёўскай і аршанскай партканферэнцый, у якім выклікае іх на далейшае прадаўжанне соцспаборніцтва паміж гэтымі раёнамі, за выкананне задач другога года 2-й пяцігодкі. Канкрэтнымі абавязацельствамі вызначаны: выкананне прамфінплана 1934 года на ўсіх прадпрыемствах, большэвіцкая падрыхтоўка і правядзенне веснавой сяўбы, своечасова правесці ўборку і здаць сельска-гаспадарчую прадукцыю па абавязковых пастаўках. Перад спаборнічаючымі раёнамі высунута задача першымі ў БССР закончыць веснавую сяўбу.

Сёння канферэнцыя вылучыла дэлегатаў для правядзення на прадпрыемствах Барысаўшчыны—«Пролетарская перамога», заводзе імя Дом Парыжскай Камуны і «Комінтэрн» мітынгаў у сувязі з разгортваннем масавай падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б).

ІВАШЫН.

РАГАЧОЎ

7 студзеня пачала сваю работу раённая партыйная канферэнцыя. Прысутнічае 170 дэлегатаў. У ганаровы прэзідыум выбраны: палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з тав. **Сталіным**, Бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Гікало**.

Канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы: ЦК КП(б)Б — тав. **Гікало**, палітсектару МТС Наркамзема БССР — тав. **Ратнеку**, цэнтральнаму органу КП(б)Б **«Звязда»**.

Сакратар РК **Геўрасёў** зрабіў даклад аб рабоце раённага камітэта КП(б)Б.

СТАРОБІН

5-га студзеня закончыла сваю работу старобінская партканферэнцыя. Па ўсіх пытаннях парадка дня канферэнцыі выказалася 50 дэлегатаў. Заключана 13 соцдагавароў паміж дэлегатамі паасобных партячэек. Партканферэнцыя прыняла на сябе вад абавязацельстваў і выклікала на соцспаборніцтва Чырвоную Слабаду па сканчэнне ўсіх гаспадарчых кампаній да 15 з'езда КП(б)Б.

У склад новага райкома выбралі 17 членаў і 6 кандыдатаў. На з'езд КП(б)Б выбраны два дэлегаты з пастаноўчым голасам і два з дарадчым.

На адбыўшымся пленуме новавыбранага райкома выбрана бюро з 5 членаў і 2 кандыдатаў.

Лісковіч, Бакрчанка.

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА

Райпартканферэнцыя ўзяла на сябе абавязацельства да 15 з'езда КП(б)Б ліквідаваць прарыў у лесазагатоўках і вывазцы, дабіцца выканання плана на надзяленне бескарольных калгаснікаў цёлкамі, закончыць ільназагатоўкі і як след разгарнуць падрыхтоўку да вясны.

У склад РК абрана 15 чалавек і 5 кандыдатаў. Рэўкамісія абрана з 3 чалавек і 1 кандыдата. На 15 з'езд КП(б)Б выбрана 2 дэлегаты з правам рашаючага голаса і 1 з дарадчым.

4 студзеня, пасля закрыцця канферэнцыі, адбыўся пленум арганізацыйны. Сакратаром РК абран тав. **Бурэлёў**, намеснікам сакратара тав. **Фрэйнклах**.

УЗДА

5 студзеня 1934 года адкрылася 3-я райпартканферэнцыя Уздзеншчыны. На канферэнцыі прысутнічала 115 дэлегатаў і прадстаўнік ЦК тав. **Браўксвіч**. Сакратар РК КП(б)Б тав. Місцікевіч у сваім дакладзе адзначыў рад дасягненняў у рабоце партарганізацыі. Хлебапастаўкі выкананы на 101 проц., план кантрактацыі цёлак выканан на 90 проц., гадавы план мабілізацыі сродкаў выканан на 100 проц. **Адстаючы ўчастак — ільназагатоўкі. На 5 студзеня план ільназагатовак выканан усяго на 73 проц.**

Па дакладах райкома і райКК выступілі ў спрэчках 23 чалавекі. Канферэнцыю віталі піянеры беларускай і ўдзенскай ШКМ, курсы бухгалтараў і трактарыстаў Уздзенскай МТС, Алуфраўскі вучэбны пункт да прызыўнікаў, перадавы соўгас раёна Кухцічы і інш.

7-га студзеня з дакладам аб соўгасна-калгасным будаўніцтве ў раёне выступіў старшыня РВК тав. **Мікулёч.**

Фордман, Снітко.

ЖЫТКАВІЧЫ

4 студзеня закончыла сваю работу жыткавіцкая раённая партыйная канферэнцыя. На канферэнцыі прысутнічала 101 дэлегат з рашаючым голасам і каля 30 комуністаў па ганаровых білетах. У спрэчках па справаздачы РК КП(б)Б і дакладу аб калгасным будаўніцтве выказалася больш 50 дэлегатаў.

У спрэчках дэлегаты жорстка раскрытыкавалі ўсе недахопы, якія мелі месца ў рабоце партыйнай арганізацыямі, совецкіх і гаспадарчых устаноў. Крытыка разгортвалася з пункта погляда ажыццяўлення пастаноў VIII і IX пленумаў ЦК КП(б)Б. Канферэнцыя ўхваліла апублікаваныя тэзісы да XVII партыйнага з'езда.

Як у дакладах, так асабліва і ў спрэчках было падкрэслена, што РК і РВК недастаткова канкрэтна кіравалі соцыялістычнай рэканструкцыяй вёскі, недастаткова была ўвага ўзмасобнікам, зусім спаба было кіраўніцтва мясцовай прамысловасцю і рыбгасамі.

Раён знаходзіцца ў глыбокім прарыве па ільназагатоўках. Лён у раёне быў і ёсць, але вельмі многа трасты пагнаілі на сцеліішчах, дрэнна арганізавана яго апрацоўка. Шмат валакна ідзе пад мяліцу. Часта гараць сушні. Недастаткова даецца адпор пры ільназагатоўках клясаваму ворагу, арганізатарам кулацкага сабатажа.

Маючы ўсе магчымасці своечасова закончыць лесавывазку і засыпку насення, раён і тут мае прарывы.

Канферэнцыя абавязалася поўнасцю да XV з'езда КП(б)Б ліквідаваць наяўныя прарывы як па лесазагатоўках, вывазцы лесу, засыпцы насення, мабілізацыі сродкаў, так і па ільназагатоўках. На самай канферэнцыі дэлегаты паасобных советаў і калгасаў выклікалі адзін другога на спаборніцтва, заключылі тут-жа дагавары, арганізавалі штаб і яшчэ да сканчэння канферэнцыі частка дэлегатаў выехала на месца для мабілізацыі шырокіх мас на ліквідацыю прарываў.

Ад'яжджаючы з канферэнцыі, уступіўшыя ў спаборніцтва дэлегацыі паасобных сельсоветаў звярнуліся да ўсіх рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, спецыялістаў і настаўнікаў раёна з спецыяльнай адозвай, якая павінна мабілізаваць шырокія калгасныя і працоўныя масы сялянства на падрыхтоўку да 2-й большэвіцкай вясны другой пяцігодкі.

На канферэнцыі жыткавіцкая партарганізацыя заверадзіла дагавор на спаборніцтва з тураўскай арганізацыяй і прыняла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў на 1934 год.

МАКОЎСКІ.

ТЕРЭХОУКА

5-га ўвечары адкрылася 6 партканферэнцыя Терахоўшчыны. На канферэнцыі прысутнічае 100 дэлегатаў. Канферэнцыя выбрала у ганаровы прэзідыум членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), т.т. **Тэльмана, Дзімітрава, Ленскага, Гікало, Галадзеда і Лычэва.**

У парадку дня канферэнцыі стаяць справаздачы райкома, райКК і рэвізійнай камісіі, даклад аб тэзісах ЦК ВКП(б) к 17 з'езду ВКП(б) і выбары райкома, рэвізійнай камісіі і дэлегатаў на з'езд КП(б)Б.

Канферэнцыю віталі дэлегацыі рабочых прадпрыемстваў і калгаснікаў.

6-га быў заслуханы даклад сакратара райкома. У спрэчках па дакладу выказалася 29 чалавек. Усе таварышы спыняліся галоўным чынам на ходзе выканання ільназагатовак, палітычна-совецкай рабоце, падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і нацыянальна-культурным будаўніцтве.

ПРЭЗІДЫУМ КАНФЕРЭНЦЫІ.

БЯРЭЗІНА

Райпартсход пачаў сваю работу 6 студзеня.

У першы дзень заслуханы даклад сакратара РК тав. **Турыка**, абгаворана пытанне аб ільназагатоўках і паслана прывітальная тэлеграма ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО.**

Ільназагатоўкі сход абавязаўся закончыць да 10 студзеня.

Для заключэння дагавора па соцспаборніцтву сход накіраваў дэлегацыю ў Бялыніцкі раён.

Масавая прапрацоўка тэзісаў

ВІЦЕБСК. (Ад нашага карэспандэнта). Ва ўсіх прадпрыемствах Віцебшчыны праходзіць масавая распрацоўка тэзісаў да 17 з'езда ВКП(б).

Рабочы калектыў завода імя «Звязды» звыш гадавой праграмы выпрацаваў 800 кубаметраў высокаякаснай фанеры. У часе абгаварэння тэзісаў віцебскія фанерщікі абавязаліся да 17-га з'езда ВКП(б) поўнасцю выканаць праграму першага месяца другога года 2-й пяцігодкі.

З вялікай актыўнасцю абгаворваліся тэзісы на адкрытых партыйных сходах швейнага гіганта Беларусі — фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі». «Сцягаўцы» абяцалі прыкласці ўсе сілы для канчатковай ліквідацыі прарыва.

Горача сустрэлі тэзісы т.т. **Молатава і Куйбышева** рабочыя іголкавай фабрыкі. На фабрыцы разгортваецца праверка выканання самазабавязацельстваў, узятых рабочымі ў падрыхтоўцы да 15-га з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б).

На заводзе сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва «Чырвоны металіст» агульны сход рабочых адназгодна прыняў рэзалюцыю, у якой ухваляе тэзісы і патрабуе ад усіх рабочых і ў першую чаргу ад комуністаў дабіцца рашучага перазлома ў рабоце, асабліва ў выкананні баявога ўрадавага задання—выпуска запчастак да трактараў і трактарных плугоў.

З такой-жа актыўнасцю праходзіць распрацоўка тэзісаў на панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін, лесазаводзе імя «Пожады», броварах і дражджавых заводах і на астатніх прадпрыемствах Віцебшчыны.

Распрацоўка тэзісаў перанесена ў гушчу рабочых мас — у брыгады і паасобныя ўчасткі.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Выканаць студзеньскае задание па дастаўцы дроў Менску

6-ы эксплаатацыйны раён Заходняй чыгункі (начальнік раёна тав. ЕРАМАЕЎ) прадаўжае зрываць снабжэнне Менска дровамі. Адказны план падачы вагонаў пад пагрузку дроў, зацверджаны Масквой, НЕ ВЫКОНВАЕЦЦА. Замест штодзённых 86 вагонаў у сярэднім грузяцца толькі 62 вагоны прычым у гэту лічбу ўваходзіць таксама вяртушка, арганізаваная начальнікам ст. Менск тав. ЛАДЗІСАМ па ініцыятыве «Звязды». Калі яшчэ ўлічыць, што адказны план падачы вагонаў выконваецца амаль выключна баластнымі плацформамі, якія ўмяшчаюць менш звычайнага крытага вагона, дык рэальныя вынікі дастаўкі дроў Менску будуць яшчэ меншыя.

Чыгуначныя арганізацыі павінны зрабіць з гэтага адпаведныя вывады. АДКАЗНЫ ПЛАН ЗАСТАЕЦЦА АДКАЗНЫМ ПЛАНАМ. Невыкананне адказнага плана сведчыць аб радзе БУЙНЫХ НЕДАХОПАЎ у рабоце кіраўніцтва 6-га эксплаатацыйнага раёна Заходняй чыгункі.

«Звязда» не раз указвала, якія агіднасці дапускае кіраўніцтва 6-га раёна ў руху адных толькі вяртушак, колькі ДЗЕСЯТКАЎ ГАДЗІН прастойваюць вяртушкі па віне вельмі невыразнай, агіднай работы дыспетчарскіх аддзелаў Заходняй чыгункі. Толькі за кошт ліквідацыі пішніх прастояў можна было-б выканаць адказны план адгрузкі дроў Менску.

Мы патрабуем ад Улаўнаркамшляху давесці да ведама начальніка і палітаддзела Заходняй чыгункі аб усіх недахопах у рабоце 6-га раёна. Час пакласці канец расхлябанасці і злачынней кядбайнасці!

***

Заданне ЦК КП(б)Б Заслаўскаму, Менскаму, Лагойскаму, Чэрвеньскаму і Пухавіцкаму раёнам аб дастаўцы Менску гужавым транспартам да 20 снежня 7.500 кбм. дроў паасобнымі раёнамі дагэтуль не выканана. З усіх гэтых раёнаў толькі ЗАСЛАЎСКІ перавыканаў сваё задан не на 25 проц., ЧЭРВЕНЬСКІ і ПУХАВІЦКІ недадалі: першы — 7 кбм., другі—35 кбм., а МЕНСКІ і ЛАГОЙСКІ недадалі на 1 студзеня 106 і 590 кбм. Такім чынам, не гледзячы на падзенне тэрміна выканання задання (замест адной дэкады — дзве), Менскі і Лагойскі раёны апынуліся ў хвасце, прычым Лагойскі раён выканаў сваё заданне толькі на 41 проц. Ганебная работа!

**Зараз ЗАСЛАЎСКІ, ПУХАВІЦКІ, ЛАГОЙ

ШЫРЭЙ ФРОНТ СПАБОРНІЦТВА НА ГОДНАСЦЬ ЛЕПШАЙ МТС І МТМ

ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ У МАЙСТЭРНЯХ, ЦВЁРДЫ ГРАФІК РАМОНТА ВЫРАШАЮЦЬ ПОСПЕХ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗДАРОВЫ ТРАКТАР

ВАРТА ТОЛЬКІ ЗАХАЦЕЦЬ

Ліст рэбочых-ударнікаў Гарадоцкай МТМ

У сваім лісце мы хочам расказаць аб нашых нядучах у пачатку рамонтнай кампаніі, як мы іх ліквідавалі, якія недахопы ё нас яшчэ ёсць і як мы рыхтуемся да з'езду партыі.

ГАРАДОЦКАЯ МТМ абсталявана поўнасцю. Механічны цэх — лепшы ў МТМ Беларусі. Ёсць фрэзерны станок. Словам, усе ўмовы для сваячасовага і паспяховага правядзення рамонта трактараў.

Наша вытворчая праграма такая: адрамантаваць 105 аджнак у тым ліку: 30 трактараў поўнасцю і 75 матораў, апрача плугоў і іншага інвентара. Па месяцах праграма разбіваецца так. У кастрычніку — 10, у лістападзе — 20. За гэтыя два месяцы, мы, сорам сказаць — адрамантавалі толькі... 5 матораў. Былое кіраўніцтва МТМ, на чале з дырэктарам **Ласіжкім**, не змагалася за большэвіцкія парадкі ў МТМ, не старалася забяспечыць рамонт матарыяламі і запаснымі часткамі, а проста зрывала работу.

Тут палітаддзел Гарадоцкай МТС і персанальна начальнік тав. **БЛЮМКІН** непасрэдна занятся справамі МТМ. Парашыў: зняць з работы дырэктара МТМ Ласіжскага, а на яго месца 29 лістапада часова прызначыў інструктара трактарацэнтра тав. **КІСЯЛЁВА**, які прыехаў у МТМ. Трэба аддаць справядлівасць тав. Кісялёў узяўся за работу па-большэвіцку.

Перад ім і ўсімі намі стаяла складаная задача: выканаць снежаньскую праграму рамонта 22 трактараў і за назначанасць мінулых месяцаў — 25 аджнак, а ўсяго — 47 трактарных матораў. Такім чынам, мы паставілі задачу: за снежань выканаць усю праграму IV квартала — 52 маторы, і мы паспяхова выконваем гэтую задачу.

Якія мерапрыемствы былі праведзены намі пад кіраўніцтвам і пры непасрэднай дапамозе палітаддзела МТС?

Зашклілі памяшканні МТМ (раней былі набіты шыбы ў вокнах, вецер гайсаў па карцусах), забяспечылі майстэрню дровамі; вынялі з майстэрні 3-х культаёў — слесараў Німіцыну, Відзона, Рачынскага (да рэчы, яны і не спецыялісты, а проста баласт), абвясцілі вайну прагулам, спазненням, узялся за павышэнне прапоўнай дысцыпліны.

Распрацавалі вытворчы план, заданне давялі да кожнай брыгады, заданне не на словах, а на справе, так, што кожны рабочы яго ведае, ведае і тэрміны выканання на пяцідзеўках. Па-новаму пабудавалі і брыгады: 3 мантажных на чале з брыгадзірамі: **Тупяковым** (комсамольская брыгада), **Тарасавым і Ерамеевым**. Склалі падсобныя брыгады: мядзянцкая — брыгадзір Ізраілеў, рамонт задніх мастоў—Быкаў, кавальская — Сафонаў, увялі рэгулярныя вытворчыя нарады, знішчылі абязліч ку. Нагул, майстэрню прывялі ў парадак.

Вынікі ўжо маем: на 15 снежня было адрамантавана 24 маторы і 5 задніх мастоў, на 25 снежня — 32 маторы і 12 задніх мастоў. Да 5 студзеня мы адрамантавалі 84 аджнакі, у тым ліку 41 матор. Мы лічым сваім гонарам і абавязкам (магчымасці ўсе ёсць) скончыць сваячасова рамонт.

Прыклад гэтаму — тэмпы брыгады Тарасава, якая за 11 дзён адрамантавала 11 матораў, брыгада (комсамольская) Тупякова за 4 дні — 3 маторы і т. д. Мы ўжо мелі адрамантаваць значна больш матораў, каб адміністрацыя не запусціла памылкі: рамонтныя брыгады самі пачалі на правяску матораў, у той час як было б больш матэрыялаў для гэтага скласці асобную брыгаду.

Добры прыклад работы паказала брыгада кавалёў (брыгадзір т. **САФОНАЎ**): дагэтуль 3 кавалі заклёпвалі 15 шпор, зараз—50 шпор у дзень.

Смела можам сказаць, што і якасць рамонта сёлета непараўнальна вышэйшая, чым у мінулым годзе. Аб гэтым гаворыць акты аўтарытэтных камісій, якія прымаюць гатовыя маторы. У актах заўсёды адзнака: «якасць рамонта добрая».

Выяўлены недахопы выпраўляюцца на-ходу і прымаюцца меры, каб яны не паўтараліся. Важна вось што: пры пропуску выяўляюцца ўсе наймалейшыя недахопы і зараз-жа выпраўляюцца, кожны матор з майстэрні выходзіць здаровым на 100 проц.

Такіх поспехаў шэф кіраўніцтвам палітаддзела МТС і дырэктара т. Кісялёва мы дабіліся менш чым за месяц.

Але ёсць і недахопы, якія трэба яшчэ ліквідаваць. Не можам мы адмаўляць старыя дэталі (чарвячныя валы, шасцерні і г. д.), няма кісларода.

Адсталым участкам з'яўляецца тэхнімазанне, не праведзена тарыфная рэформа. У корпусу—дым. Вентыляцыя не працуе. Рухавік без дапамогі трактара ў пачатку работы не можа рушыцца: кампрэсар не ў парадку. Часамі няма і такіх «дробязей», як наждачная папера, што затрымлівае шліфоўку.

Памяшканне для рабочых яшчэ не адрамантавана. Дроў для рабочых няма. Леспрамгас не лічыць сваім абавязкам забяспечваць нас апалам. Харчаванне палепшылася, але недастаткова. З цэнтралізаванага снабжэння нічога, апрача хлеба, не атрымліваем. Раённыя арганізацыі (райком, РВК) выносілі пастановы аб дапамозе МТМ, але, відаць, забылі пра гэтыя пастановы. Сталоўка ў нас—проста хлеў: холадна, брудна, дрэнныя сталы, лаўкі. Няма відэльцаў, нажоў: мяса прыходзіцца браць пальцамі, а рукі ў нас, вядома, брудныя. Няма цёплай вады для мыцця рук.

Праўда, Палітаддзел МТС прыняў меры, каб у бліжэйшы час ліквідаваць і гэтыя недахопы як па майстэрні, так і па бытавых пытаннях.

Усё, што мы сказалі, ясна гаворыць аб адным: **МЫ МОЖАМ ВЫКОНВАЦЬ ЗАДАННІ ПАРТЫІ І УРАДА НАВАТ У СКАРОЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ, ВАРТА ТОЛЬКІ ЗАХАЦЕЦЬ ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ.**

У адзнаку надыходзячых з'ездаў партыі мы бярэм на сябе наступныя самаабавязацельствы:

Да 10 студзеня, да дня склікання райпартканф рэнцыі, адрамантаваць **72 МАТОРЫ;**

Да 16 студзеня—дня адкрыцця XV з'езда КП(б)Б—адрамантаваць **85 МАТОРАЎ**, т. зн. выканаць гадавую праграму.

І звыш плана бярэмся адрамантаваць 15 матораў сістэмы Наркамсоўгасаў.

Узятыя на сябе самаабавязацельствы мы выканаем поўнасцю, напружыўшы ўсю сілу і энергію на заваёву першынства ў спаборніцтве з Ленінградскай, Заходняй, Іванаўскай і Чэрнігаўскай абласцямі. З свайго боку патрабуем ад Наркамзема БССР прыняць меры да забеспячэння нашай майстэрні ўсімі неабходнымі запаснымі часткамі і матэрыяламі для рамонта трактараў.

Больш адказнасці, больш дбайнасці і ўпартасці, шырэй соцспаборніцтва на годнасць лепшай МТМ—і мы ўсе спаткаем з'езды партыі вялікімі дасягненнямі ў рамонце стальных коней — трактараў.

На соцспаборніцтва мы выклікаем **ЛЕПЕЛЬСКУЮ і ГОРАЦКУЮ МТМ.**

МАСЛАЎ—старшы механік, член бюро ячэйкі КП(б)Б.

САФОНАЎ—брыгадзір кавальскай брыгады,

ТАРАСАЎ, ТУПЯКОЎ, ЕРАМЕЯЎ—брыгадзіры мантажнай брыгады,

СЯМЕНАЎ — слесар—ударнік комсамольскай брыгады,

БУХБІНДЗЕР—токар, сакратар ячэйкі ЛКСМБ.

РАГАЧОЎСКАЯ МТМ ВЫКАНАЛА ПЛАН РАМОНТА

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу)

План рамонта трактароў па Рагачоўскай МТМ перавыкананы. На першае студзеня, замест 76 трактараў адрамантавана 81. Да з'езда партыі рабочыя абавязаліся перавыканаць усё заданне па рамонту.

Душыцелі рабочай ініцыятывы

Машына-трактарная майстэрня **Магілёўскай МТС** зрывае план рамонта трактараў. Да 25 снежня МТМ павінна была з 24 трактараў, вызначаных агульным планам, адрамантаваць не менш 12. Адрамантавана-ж толькі 6. Прарыў тым больш небяспечны, што ўсе 24 трактары патрабуюць капітальнага рамонта.

У МТМ ёсць усе магчымасці выконваць рамонт у строга вызначаныя тэрміны. Па-першае, МТМ добра механізавана (трактарны і свідравальны варштаты, апарат для аўтагеннай зваркі, варштат для расточкі шатунных падшыпнікаў і т. д.) Па-другое, майстэрня поўнасцю ўкамплектавана рабочай сілай.

Але ўся бяда ў тым, што кіраўнікі майстэрні не здолелі правільна расставіць рабочую сілу, не ўвялі здзельшчыну, не пераносяць лепшы вопыт работы ў адстаючыя звенні. Дырэктар тав. Банчук і рабочком не прынялі мер для ліквідацыі прарыва ў рамонце.

Больш тыдня назад рабочыя майстэрні ўключыліся ў вытворчы паход імя XVII партз'езда. Яны ўзялі на сябе рад абавязкаў па ліквідацыі адставання ў рамонце. Да XVII парт з'езда рабочыя абавязаліся, шляхам разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва поўнасцю выканаць план рамонта трактараў, даўшы высокую якасць работы. Але старшыня рабочкома тав. Госін нядбайна адносіцца да ініцыятывы перадавых рабочых. Соцдагавары паміж брыгадамі дагэтуль не афармлены і не правяраюцца, зусім не разгорнута індывідуальнае спаборніцтва.

Больш таго, рабочком сам дэмабілізуе рабочых. Аб гэтым ярка сведчыць наступны факт. У сталоўцы МТМ рабочком павесіў плакат: «да адкрыцця XVII партз'езда выканаць план рамонта трактараў IV квартала» (?!). І гэта ў той час, калі рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства да XVII партз'езда выканаць поўнасцю план рамонта трактарнага парка.

Няма рашучай барацьбы з лодырамі і прагульшчыкамі. З 25 снежня 2 трактарысты **Гаравыя** не з'явіліся на работу і без уважлівых прычын прагулялі два дні. У адносінах злосных прагульшчыкаў **Добрыка, Жылавачыка, Панцялеева, Сабалеўскага** і інш. не прынята ніякіх мер.

Рамонт трактарнага парка павінен быць выкарыстан як школа для павышэння кваліфікацыі маладых трактарыстаў. Трактарысты павінны прыняць удзел у рамонце, разборцы і зборцы трактараў. Але кіраўнікі МТС гэтага не ўлічылі. З 46 трактарыстаў (у большасці зусім нявопытных) пры рамонце прысутнічаюць толькі 2.

Я. ГЛУШЫНСКІ.

ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ЗРЫЎ РАМОНТА ТРАКТАРАЎ

Дзяржынская МТМ (старэйшая ў БССР) па свайму абсталяванню і ўкамплектаванасці кваліфікаванымі кадрамі знаходзіцца на першым месцы. Пры здавальняючай забяспечанасці запаснымі часткамі да трактараў марак «ФП» і «ХТЗ» бабітам і волавам, майстэрня сістэматычна зрывае план рамонта. На 30 снежня 1933 г. план зімовага рамонта выканан усяго на 11 проц. У той-жа час другія майстэрні (Рагачоўская і Клімавіцкая і інш.) пры меншых магчымасцях перавыканалі свой план.

Галоўнай прычынай зрыву рамонта ў дзяржынскай МТМ з'яўляецца дрэнная арганізацыя працы. Дырэкцыя МТМ добра ведала дэфіцытнасць запасных частак да трактараў «Джон-Дзір». Не гледзячы на гэта па загаду дырэкцыі былі разабраны трактары «Джон-Дзір», часткамі якіх зараз завалена ўсё памяшканне майстэрні. У той-жа самы час да рамонта трактараў «ХТЗ» і «ФП» не прыступлена, не гледзячы на наяўнасць запасных частак да іх. Характэрна, што 75 проц. прымацаваных для рамонта ў МТМ трактараў, забяспечаны запаснымі часткамі.

У выніку бяздзейнасці дырэкцыі ў МТМ дагэтуль не закончана ўстаноўка ацяпляльнай сістэмы і не створан запас нафты для сілавой устаноўкі. Дырэкцыя вельмі мала клапаціцца аб матэрыяльна-бытавых умовах рабочых. У выніку план рамонта ў чацвертым квартале сарваны.

За злачынную бяздзейнасць і не жаданне выконваць важнейшыя дырэктывы партыі і ўрада дырэктар дзяржынскай МТМ тав. **ГАЛАВАЧ** загадам па Наркамзему ад 5 студзеня знят з работы і прыцягнут да судовай адказнасці.

Усе матэрыялы аб работе Галавача Наркамзем накіраваны пракурору рэспублікі.

За адсутнасць дапамогі МТМ, праяўленне поўнай бестурботнасці ў справе падрыхтоўкі машынатрактарнага парка да вясны, дырэктару Дзяржынскай МТС тав. **АТАХЕЛЮ** Наркамзем абвешчана суровая вымова з папярэджаннем.

ПАСЛЯ ЎРАЧЫСТЫХ АБЯЦАННЯЎ...

З вялікай урачыстасцю праходзіў схід. У тучных прамовах адзначалі вялікую ролю трактара ў веснавой сяўбе, гаварылі аб значэнні якасці рамонта і датэрміновага сканчэння рамонтнай кампаніі. Выступаў з прамовай і тав. **Селязнёў**—дырэктар Менскай МТМ. Ён горача кляўся, што дырэктывы партыі і ўрада МТМ з гонарам выканае, што да 15 лютага рамонт будзе скончан поўнасцю і з высокаякаснымі показальнікамі.

Так і запісалі ва ўрачыстай рэзалюцыі: «рамонт скончыць не пазней 15 лютага». Наступілі будні, рэзалюцыю надышлі да справы, а з ёй і ўрачыстае абяцанне.

Па плану Менская МТМ павінна адрамантаваць 124 трактары і 121 матор. Да 1 студзеня гэты план трэба было выканаць не менш як на 50 проц. Адрамантавана-ж толькі 8 трактараў і 66 матораў. Такім чынам план рамонта трактараў сарван.

Якія-ж прычыны ганебнага прарыва? Дырэктар МТМ тав. **Селязнёў**, сакратар парт'ячэйкі тав. **Конвісер** і тэмпічны кіраўнік майстэрні тав. **Герасімовіч** тлумачаць гэта выключна «аб'ектыўнымі» прычынамі, не хапае, моў, кваліфікаванай рабочай сілы, 12 матарыстаў, 4 токараў і 20 мантажнікаў. Не хапае і многіх запасных частак, як чарвячных валаў, упорных падшыпнікаў чарвячнага вала, ролікавых падшыпнікаў 351, падшыпнікаў пярэдніх колаў і інш. І самае галоўнае, да 1 студзеня не было памяшкання для мантажных работ. Трактары збіралі ў невялічкай каморцы маторнага цэха, а частку—зусім на двары.

Аднак, хто-ж вінават у гэтых самых «прычынах», калі не тыя-ж кіраўнікі Менскай МТМ? Хіба не яны пазбавілі Менскай МТС зімовага пакланаціцца і аб забеспячэнні майстэрні кваліфікаванай рабочай сілай, і аб запасных частках для трактараў і аб памяшканні для мантажных работ? Сапраўдная прычына заключаецца ў дрэнным падрыхтоўцы да гаматнай кампаніі, у слабым кіраўніцтве самім вытворчым працэсам з боку трыкутніка МТМ.

Пачнем з таго, што ў майстэрні зусім адсутнічае працоўная дысцыпліна. Большасць рабочых штодзённа з'яўляецца на работу з вялікім спазненнем. За лістапад і снежань гэтыя спазненні складалі каля 500 гадзін рабочага часу. Спазненні ўвайшлі ў сістэму і на іх дырэкцыя зусім не рэагуе.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты паміж брыгадамі і асобнымі рабочымі МТМ. Парт'ячэйка і рабочком нічога не зрабілі для таго, каб укараніць соцыялістычныя метады працы на рамонце трактараў.

—У нас былі ўдарныя брыгады—прызнаецца сакратар парт'ячэйкі тав. **Конвісер**— і спабогічалі адна з адной, але мы не ўлічвалі іх работы і справа заглохла.

Імкнна, у выніку адсутнасці соцспаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнасці фастлумачальнай работы і кантроля, якасць выпускаемых з рамонта трактараў зусім нізкая. У цэхах з кожным днём расце брак. **Асабліва процант брака ў маторным цэху, дзе адрамантаваныя маторы часта зноў прыходзіцца разбіраць і спраўляць.**

Брак па заніўцы падшыпнікаў (за ліўшчык **Казэкоў**) дасягае да 50 проц. Залітыя бандражам падшыпнікі часта прыходзіцца перазаліваць і перашаброўваць па некалькі разоў. Рабочыя гоняцца за колькасцю а за якасцю рамонта зусім не сочаць.

МТМ увахоліць у сістэму Наркамсоўгасаў, але апошні амаль зусім не цікавіцца работай майстэрні. Ніякага кіраўніцтва і дапамогі з боку НКсоўгасаў МТМ не бачыць.

К. І Г.

Зводка аб ходзе рамонта трактараў па МТМ БССР

На 30 снежня 1933 года (у процантах)

№ п. п.	МТМ	Адрамантавана ўсяго трактараў і матораў	Проц. выканання плана
1.	Клімавіцкая	58	63,7
2.	Рагачоўская	74	54,0
3.	Горацкая	38	47,5
4.	Слуцкая	88	46,3
5.	Гомельская	44	40,7
6.	Гарадоцкая	32	33,3
7.	Лепельская	33	25,2
8.	Аршанская	20	11,4
9.	Дзяржынская	18	11,0
10.	Віцебская	6	5,9
11.	Даманавіцкая	7	5,5
12.	Полацкая	—	—
	Разам па МТМ БССР:	418	27,7

АБ РАБОЦЕ І САНІТАРНЫМ СТАНОВІШЧЫ ХЛЕБАЗАВОДАЎ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Хлебапякарная прамысловасць Беларусі за апошнія два гады з дробнага распыленага саматужнага промысла вырасла ў буйную механізаваную прамысловасць. На 1 красавіка 1931 года ў БССР было 4 хлебазаводы і 16 пякарань з сутачнай магутнасцю ў 464 тоны, а на 1 снежня 1933 г. ёсць 12 хлебазаводаў і 29 механізаваных і саматужных пякарань з сутачнай магутнасцю ў 950 тон. Удзельная вага механізаванага хлебапячэння ўзрасла з 51 да 83 проц.

Лік рабочых у хлебапякарнай прамысловасці ўзрос з 700 да 3.000 чал. Прадукцыйнасць працы вырасла на 52,6 проц.

Значна палепшаны сацыяльна-бытавыя ўмовы рабочых (арганізацыя ўласнай харчовай базы, ёсць 10 сталовак, 9 свінарнікаў з паталоўем 460 свіней; 9 клубаў і чырвоных куткоў).

Аднак, не гледзячы на гэта, якасць выпякаемага хлеба і агульна-санітарнае становішча хлебазаводаў і хлебапякарань працяўжае заставацца зусім невадавальняючым, не адпавядае ўзросшым культурным патрэбам рабочага спажыўца і патрабуе рашучага паляпшэння.

Улічваючы асобае значэнне хлебапякарнай прамысловасці ў справе снабжэння прапоўных Беларусі добраякасным печаным хлебам і ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) ад 22 снежня аб санітарна-гігіенічных мерапрыемствах па харчовых заводах і фабрыках, — ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць дырэктара трэста Белпрамхлеб т. **Барзунова**, старшыню ЦП саюза МКХП т. **Курыцкую** і трыкутнікі хлебазаводаў у адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) ад 22 снежня, на аснове разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва па выкананню соцдагавора з пекарамі Данбаса, распрацаваць рад мерапрыемстваў, забяспечваючых рашучы пералом у паляпшэнні якасці выпякаемага хлеба і ліквідацыі брака, укараняючы на прадпрыемствах лепшыя ўзоры соцыялістычных метадаў работы, выяўленых на ўсебеларускім злёце пекараў-ударнікаў.

2. Абавязаць дырэктароў хлебазаводаў укамплектаваць лабараторыі кваліфікаванымі работнікамі з перанясеннем цэнтра цяжара іх работы ў цэх (правядзенне сваячасовых аналізаў сырца, паўфабрыкатаў і гатовай прадукцыі, пробных выпечак, складанне рэцэптур з вывешваннем іх у брыгадах).

Дырэктару трэста т. **Барзунову** ў першым квартале 1934 года правесці курсы па падняццю кваліфікацыі лабараторных работнікаў.

3. Абавязаць дырэктароў хлебазаводаў у дэкадны тэрмін арганізаваць дасканалы прагляд усіх памяшканняў, правесці ачыстку ўсіх агрэгатаў, прывесці ўсе памяшканні і абсталяванне ва ўзорны выгляд, устанавіць суровы кантроль за санітарным становішчам, увесці ў сістэму спецыяльныя санітарныя запісы пры перадачы і ацэнцы змен.

Абавязаць Наркамат аховы здароўя прыняць меры да ўзмацнення санатляда на хлебазаводах.

4. Абавязаць дырэктароў хлебазаводаў і гандлюючыя арганізацыі забяспечыць выкананне загада наркам снаба СССР т. Мікаяна і Саюзпрамхлебапячэння аб водпуску хлеба франко-хлебазавод.

5. У мэтах знішчэння меўшых месца перабояў па раду гарадоў (Менск, Орша, Рэчыца і інш.) снабжэнні хлебазаводаў дровамі, электраэнергіяй, што зрывае выкананне плана выпуску прадукцыі і адбіваецца на якасці хлеба, прапанаваць гарадскім і раённым камітэтам партыі, гарсаветам і РВК забяспечыць першачарговае снабжэнне хлебазаводаў дровамі і электраэнергіяй, не дапускаючы ніякіх перабояў.

6. Адзначаючы слабы кантроль з боку ВХІ і бракеражы, а прычыны чаго мелі месца выпадкі выпуску нядобраякаснага, сырога хлеба з хлебазаводаў у магазіны, — абавязаць упадпраўленняга хлебай (Іспаніцкі) т. Нісенбаума забяспечыць устаўленне жорсткага кантроля і бракажу хлеба, не дапускаючы водпуску з хлебазавода ў магазіны ні аднаго кілаграма нядобраякаснага хлеба.

7. Абавязаць гарсоветы, райвыканкомы і райпрафсоветы гарадоў Менск, Гомель, Орша, Віцебск, Бабруйск, Магілёў, Рэчыца, Мазыр, Полацак, Барысаў, і Жлобін выдзеліць замест пля ўчасткі хлебазаводам для вяцця прыгарадных гаспадарстваванняя ўласнай харчовай базы, забяспечыўшы іх насеннем.

8. У сувязі са значным ростам рабсілы і прытокам новых кадраў рабочых прапанаваць ЦП саюза МХКП, гарадскім і раённым камітэтам партыі і гаррайпрафсоветам (у асаблівасці гарадах: Барысаве, Бабруйску і Рэчыцы) забяспечыць ужыванне прафарганізацыі хлебазаводаў праверанымі, палітычна падрыхтаванымі работнікамі.

9. Абавязаць ЦП саюза МКХП і трэст Белпрамхлеб у 1934 г. пабудаваць дзіцячы сад і яслі для дзяцей рабочых-пекараў г. Менска.

10. Прапанаваць Белпрамхлебу і ЦП саюза МХКП паставіць пытанне перад ЦК саюза і Саюзпрамхлебапячэннем аб водпуску сродкаў на пабудову сталовых-клубаў для рабочых-пекараў у г. Гомелі і Віцебску.

11. Адзначаючы наяўнасць фактаў наўмыснага псавання хлеба і абсталявання, раскрадання прадукцыі і сырца, што сведчыць аб пранікненні на хлебапякарныя прадпрыемствы класава-чужых, кулацкіх элементаў, — прапанаваць трыкутнікам хлебазаводаў узмацніць класавую пільнасць, рашуча выганяючы з прадпрыемстваў варожыя і хлебапяку-жыя элементы, вялучы рашучую барацьбу з раскраданнем і разбазарваннем хлеба і разгільдзяйствам на вытворчасці.

12. Ухваліць мерапрыемствы трэста Белпрамхлеб і ЦП саюза мукамольна-хлебапякарнай і кандытэрскай прамысловасці па арганізацыі соцспаборніцтва рабочых-пекараў Беларусі з пекарамі Данбаса, правядзенню ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці хлеба і разгортванню соцспаборніцтва паміж прадпрыемствамі на лепшую падрыхтоўку да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б).

З БІРА-БІДЖАНА

МЕНСК, ЦК КП(б)Б.

Трэцяя райпартканферэнцыя большэвікоў Біра-Біджана шле сваё вялікае большэвіцкае прывітанне ЦК КП(б)Б. Праводзячы ў жыццё ўказанні нашага вялікага правадыра тав. **Сталіна**, наш раён пачынае ліквідаваць сваё адставанне. Упершыню 15 снежня выканан гадавы план хлебазагатовак. Пастанова ЦК, СНК аб ільготах для ДВК дае вялікія магчымасці ператварыць Біра-Біджан у квітнеючы край. Працоўныя масы Біра-Біджана абяцаюць пад кіраўніцтвам ЦК і крайкома ператварыць Біра-Біджан у непрыступную крэпасць соцыялізма на Далёкім Усходзе.

Няхай жыве ВКП(б), яе любімы правадыр т. **Сталін**! Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Прэзідыум канферэнцыі.

І. ЛЫЧОЎ

АБ БАЦЬКАХ І ДЗЕЦЯХ

Праграма ВКП(б) у галіне народнай асветы ставіць перад намі задачу аграмаднай палітычнай важнасці «пераўтварэння школы са зброі класавага панавання буржуазіі ў зброю поўнага знішчэння падзела грамадства на класы». Совецкая школа павінна выхаваць пакаленне, «здольнае канчаткова ўстанавіць комунізм».

Гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) аб масавай школе дае нам разгорнутую баявую праграму дзеянняў у барацьбе за выхаванне маладога пакалення, свядомых і актыўных будаўнікоў комуністычнага грамадства.

Дзякуючы правільнаму правядзенню ленінскай нацыянальнай палітыкі, пад кіраўніцтвам партыі і пры актыўнай дапамозе Саюза Совецкіх Рэспублік — БССР дасягнула вялізарных поспехаў, асабліва на фронце соцкультуры. З адсталай раней у эканамічных і культурных адносінах краіны, якая была калоніяй царскай Расіі, БССР стала адной з перадавых рэспублік Совецкага Саюза. 24 проц. пісьменнасці ў дарэволюцыйнай Беларусі сталі здабыткам гісторыі. Цяпер Совецкая Беларусь — рэспубліка суцэльнай пісьменнасці. Надзвычай вырасла агульная колькасць школ і лік дзяцей, навучаючыхся ў іх. Калі яшчэ ў 1930-1931 г. мы мелі 7.144 школы з ахопам 692.148 дзяцей, то ўжо ў 1932-33 навучальным годзе было 8.610 школ, ахопліваючых 863.953 дзяцей.

Сакавіцкі пленум ЦК КП(б)Б, ускрыўшы з усёй большэвіцкай рашучасцю памылкі партыйнай арганізацыі Беларусі ў справе практычнага правядзення ленінскай нацыянальнай, даў цэлы рад выразных, канкрэтных дырэктыў па пытаннях нацыянальна-культурнага будаўніцтва, абавязаў партыйныя арганізацыі забяспечыць умацаванне большэвіцкага кіраўніцтва культурным абслугоўваннем нацыянальных меншасцей. Знеслі старога кіраўніцтва Наркамасветы, праяўшага палітычную слепату і прымірэнцтва да контр-революцыйных нацыянал-дэмакратычных элементаў, праводзіўшых у сістэме народнай асветы сваю буржуазна-шавіністычную лінію, узмацненне кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый гэтым важнейшым участкам класавай барацьбы на ідэалагічным фронце — дапамагло выпрацаць рад глыбачайшых палітычных прарываў. 1933-34 навучальны год даў нам рост школ нацыянальных меншасцей, рускіх, польскіх, яўрэйскіх і г. д. Праводзіцца вялікая ўпартая работа па выкарчоўванню перажыткаў нацдамаўшчыны — прымусовай беларусізацыі школ.

Наша школа палітычна моцна вырасла. У барацьбе за рэалізацыю пастановы ЦК ВКП(б) аб школе, за знішчэнне «карэннага недахопа», які заключаецца ў тым, што «навучанне ў школе не дае дастатковага аб'ёма агульна-адукацыйных прадметаў і не здавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і вышэйшых школ зусім пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навукі, — фізіка, хімія, матэматыка, родная мова, геаграфія і т. д.» (а пастановы ЦК ВКП(б) — школа дасягнула вялікіх поспехаў. Але супаяіцца на гэтым мы, не можам і не павінны. Совецкая школа павінна выхаваць здаровае, маладое пакаленне ўсебакова развітых, аўладаўшых «асновамі навук», выхаваных у комуністычным духу, у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, актыўных барацьбітоў за новае бясклассавае грамадства.

Выступаючы на 3-м з'ездзе комсамола, т. **Ленін** гаварыў, што тыя веды, якія наша школа дае дзіцяці, не павінны быць мёртвымі, атрыманымі шляхам зубрэння, у выглядзе гатовых форм, а жывымі, цікавымі, атрыманымі шляхам актыўнай сувязі вучобы з нашым соцыялістычным будаўніцтвам.

Вялізарную задачу аўладання тэхнікай, ведамі для ўзняцця прадукцыйных сіл нашай соцыялістычнай дзяржавы — трэба зрабіць бліжэйшай і зразумелай нашым дзецям. Трэба, каб дзеці зразумелі, што барацьба за аўладанне ведамі ёсць у сучасны момант частка барацьбы палітычнай, класавай. Трэба каб нашы дзеці ўсвядомілі, што веды — гэта вялізарная сіла ў руках пролетарыята, будуючага комунізм.

Важнейшая палітычная задача, вы сунутая другой ліцэідзкай, знішчэнне класаў і прычын, іх параджаючых, зжываенне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей — ажыццяўляецца пролетарыятам і прапоўнымі масамі сялянства ў жорсткіх класавых баях. Абвастрэнне класавай барацьбы на асобных участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва не мяцло не адбіцца і на школе, вострай зброі комуністычнага выхавання маладога пакалення.

Выхаванне дзяцей пролетарыяту і прапоўных у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма сустракае з боку класавага ворага жорсткае супраціўленне.

Прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці ў асобных комуністаў, якім партыя даручыла ганаровую справу — справу выхавання новага пакалення — аблягчае і дае магчымасць класаваму ворагу праводзіць сваю работу. А між тым не толькі на настаўніцтва або комсамол ускладаецца задача выхавання дзяцей. Ад гэтага абавязка не вызваляцца і бацькі. Аднак, асобныя бацькі і маткі і часта члены партыі і вельмі адказныя работнікі не аддаюць ніякай увагі справе выхавання дзяцей. Ёсць людзі і нават сярод членаў партыі, якія свой абавязак да дзяцей абмяжоўваюць тым, што яны нарадзілі іх і вырасцілі да школьнага ўзросту. Такія адносіны да дзяцей у корані ашыбныя і шкодныя, ад іх трэба адмовіцца. Да гэтай мысліі мы прышлі на аснове раду маючыхся ў нас матэрыялаў, на аснове якіх мы хочам паказаць яшчэ значныя недахопы ў выхаванні дзяцей. Вось прыклад:

Палітэхнізатар Лёзненскай беларускай ШКМ — **Данілаў** (былы комсамолец) не жадае, бачыце, займацца з вучнямі яўрэйскай школы, бо яны выключна недысцыплінаваныя і не прывыклі да працэсу працы. Чымжа не славуты, такі знаёмы нам тэзіс нацдамаў? Вучні яўрэйскай школы адпраўляюцца Данілавым з майстэрняў назад да сябе ў школу.

Усё гэта робіцца на вачах двух членаў партыі, працуючых у беларускай школе: загалчыка яе — **Мінавіча** і групавода **Паўленко**. У курсе гэтай справы таксама і заг. райАНА — кандыдат партыі **Углеў**. Ведае аб гэтым і партыйная ячэйка. Усе ведаюць, але ўсе маўчаць. Для тато, каб людзі загаварылі, патрабаваўся сігнал «Звязды» аб агідным выпадку антысемітызма ў Слаўнянскай школе. Прычым загаварылі гэтыя комуністы непартыйнай мовай. Члены партыі прабавалі змазаць палітычную сутнасць справы, звесці яе выключна да пытання тэхнічных непаладак. Нарэшце, замест іх сказалі сваё аўтарытэтнае партыйнае слова райКК-РСІ, вынесшая вымову т. **Углеву**, і раённая камісія па чыстцы, выключыўшая Міновіча і Паўленко з партыі.

Пад «кіраўніцтвам» такіх людзей, насіўшых у мінулым ганаровую назву членаў партыі, у школе панавалі контр-революцыйныя антысеміцкія настроі, пісаліся некаторымі вучнямі агідныя подпісы пад партрэтамі правадыроў, контр-революцыйныя лозунгі. Вучні першай ступені **Свірскі** Барыс (сын чыгуначнага рабочага), **Пазікова** (матка работніца), не абурымлівоючыя ў школе патрэбнага класавага выхавання, былі выкарыстаны класава-варожымі элементамі, аказваўшымі праз іх свой уплыў па школу.

Лёзненская райКК-РСІ, раённыя і партыйныя арганізацыі павінны ўлічыць палітычныя ўрокі гэтай справы і з усёй большэвіцкай напорыстасцю ўзяцца за канкрэтную дапамогу і кантроль над работай школ, ачышчэнне іх ад класава-варожых элементаў і ўзмацненне класавага інтэрнацыянальнага выхавання дзяцей. Той, хто думае, што для кіраўніцтва школай даволі органаў райАНА, той глыбока памыляецца. Школе патрэбна дапамога партарганізацыі ў цэлым; праф- і комсамольскіх арганізацый.

У Нахоўскай беларускай ШКМ (Рэчыцкі раён) настаўнік рускай літаратуры і мовы **Кажэмякін** вядзе выкладанне выключна на беларускай мове. Дзецям дано катэгарычнае ўказанне: па рускай літаратуры і рускай мове займацца толькі на беларускай мове. На вачах партыйнай арганізацыі класавы вораг самым нахабным чынам здзеквацца з правядзення ў жыццё ленінскай нацыянальнай палітыкі і застаецца беспакараным.

Аслабленне рэвалюцыйнай пільнасці — гэтай вастрэйшай зброі большэвіка, так неабходнай асабліва цяпер, калі класавы вораг змяніў тактыку і метады барацьбы — дало магчымасць рэлігійным сектам, недабітаму кулаку ў Беразоўскім напынальным нямецкім сельсавеце, Нараўлянскага раёна, ахапіць частку дзяцей сваім уплывам. Вучаніца Антонаўскай нямецкай школы піша ў сваім сшытку: «Серадняк, бяднак і батрак у калгасы не прымаюцца». З гэтага відаць, што дзеці там не выхоўваюцца палітычна, іх не заражаюць пафасам соцыялістычнага будаўніцтва, ім не прывіваюць соцыялістычныя метады і формы работы пролетарыята і калгаснага сялянства — соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Аб ударніцтве частка вучняў гаворыць, што «гэта такая гуль

РАШУЧА ЎЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ПРОЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ

Пастанова пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб правядзенні перавыбараў і ў звязку з гэтым па нацыянальнаму пытанню сустрэла ўсёй партарганізацыяй і шырокімі працоўнымі масамі з вялікім уздымам і адабрэннем.

У Горацкім раёне мы мелі моцную базу рассадніцтва прыгнаўскай палітыкі — былую Чыська - гаспадарчую акадэмію, іменна тут, як нідзе ў БССР, класавы вораг, нацыянал-дэмакраты, самі і праз сваіх агентаў, насаджвалі хутары. Былая сельска-гас падарчая акадэмія спецыяльна надрукавала ў сваёй друкарні планы —эксплікацыі буйных хутароў раёна. «Вучоныя» нацдэмы сваёй уласнай рукой і праз студэнтаў выводзілі на загатоўленых пашках планаў гародзікі, садзікі, абводзілі хутары.

Партыя выкрыла нацыянал-дэмакратычны рассаднік. З наседжанага нацыянал - дэмакратычнага гнязда былі выцягнуты гэтыя контр-рэволюцыянеры і разагнаны.

Чыстка парткалектыва горацкага сельска-гаспадарчага інстытута таксама выкрыла кулацкае нацыянал-дэмакратычнае ахвосце, якое акопалася ў сценах інстытута і прадаўжала агідную шкодніцкую работу.

Контр-рэволюцыйныя нацдэмы залязалі ўсюды, нават у кіраўніцтва інстытутам (БУДКЕВІЧ). Іх палітыка, іх імкненне для кожнага працоўнага БССР зразумелы. Нацдэмы, змыкаючыся з імперыялістамі—інтэрвентамі рабілі ўсё для таго, каб ператварыць БССР у калонію імперыялістаў. Чыстка выкрыла ўсё гэта пры дапамозе партыйнага калектыва, лепшай часткі навуковых работнікаў і працоўнага студэнцтва.

У інстытуце за апошні час мела месца скрыўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Прафесар РЭНАРД даказваў, што з прычыны агракультурных асаблівасцей (?!) БССР, камбайны ў нас не могуць прыжыцца. Гэта даказвалася ў той час, калі працаваўшы ў Терахоўскім раёне першы камбайн дажам сябе апраўдаў.

У праграмах сельска-гаспадарчага інстытута мела месца «ўстаноўка», згодна якой вібята з-за лёгкай захворваемасці малочных кароў туберкулёзам нельга змагацца за высокую ўдойлівасць іх. Гэта «ўстаноўка» была выкрыта ЦО «Правды». Атак Шынкевіч не толькі не прызнаў сваіх памылак, але прадаўжае настойваць на сваім. Аднак-ж з боку іншых спецыялістаў інстытута ён не сустракае.

У сценах сельска-гаспадарчага інстытута мы маем яркае праяўленне беларускага нацыяналізма з боку асобных студэнтаў. Студэнт рабфака ШУТАЎ лічыць, што ў інтересах беларусізацыі непатрэбна карыстацца падручнікамі на рускай мове.

У горацкім сельска-гаспадарчым інстытуце (акрамя рабфака) да гэтага часу не прапрацавана пастанова СНК БССР аб спрашчэнні беларускага правапіса. Гэта, у святле прыведзеных вышэй фактаў, сведчыць аб тым, што ў інстытуце не зразумелі ўсёй палітычнай важнасці пастановы аб спрашчэнні правапіса.

У інстытуце алсутнічае большэвіцкая беларусізацыя. Лекцыі ў пераважнай большасці чытаюцца на рускай мове. Па-руску выкладаюць нават і тыя выкладчыкі, якія шмат год працуюць у БССР. Больш таго, рад выкладчыкаў, якія раней выкладалі па-беларуску, зараз сталі выкладаць па-руску. (СКАВЫШ і інш.).

У праграмах інстытута няма про пістаўлення росквіта культуры ў БССР, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу, заняпаду культуры на Захадзе.

У свой час былая с.-г. акадэмія была аплотам хутарызацыі, аплотам прышчэпайшчыны. Партыя раз біла мары і дзеянні нашэмаў. Якжа змагаўся з нацдэмаўшчынай калектыў інстытута?

У часе сустрэчы калгаснікаў-ударнікаў з навуковымі работнікамі, якая адбылася ў перыяд веснавой сяўбы, ударнік-калгаснік заявіў аднаму з прафесароў інстытута:

— Калі вы разбівалі нас на хутары, мы бачылі вас амаль штодзенна. А вось зараз, калі мы будуем светлае, калгаснае, заможнае, культурнае жыццё, мы вас ніколі не бачым.

Гэта заява надзвычай характэрна. Інстытут амаль нічога не зрабіў для таго, каб умацоўваць у гаспадарча-палітычных адносінах калгасы раёна.

Самы факт, што Горацкі раён увесь час знаходзіцца на чорнай дошцы пры наяўнасці такой вялікай культурна-палітычнай сілы, як с.-г. інстытут, гаворыць сам за сябе. Больш таго, на самым апошнім месцы ў раёне ва ўсіх адносінах і галоўным чынам па ільну знаходзіцца падшэфны інстытуту КАЦЯЛЕЎСКІ сельсавет.

Апошнія пастановы пленума ЦК КП(б)Б павінны легчы ў аснову ўсёй работы інстытута. Павінен быць мабілізован увесь партыйны і комсамольскі калектыў, студэнцтва і навуковыя работнікі інстытута на рэалізацыю пастановы пленума.

Неабходна бязлітасна змагацца з праяўленнямі контрреволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма—галоўнай небяспекі на даным этапе ва ўмовах БССР, з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небяспекі ва ўмовах СССР і з праяўленнямі шавінізмаў іншых колераў.

Горацкі сельска-гаспадарчы інстытут павінен стаць большэвіцкай кузняй сацыялістычных кадраў дзіраў сельскай гаспадаркі.

Яўх Гольдшварц.

Гор. ГОРКІ.

ЗА ЗРЫЎ ПАДПІСКІ І ДАСТАЎКІ ГАЗЕТ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЦІ

(Ліст работніка друку).

Арганізацыя падпіскі, дастаўка газет і журналаў у Барысаўскім раёне пастаўлена зусім дрэнна.

У калгасе **«Ударнік»**, **Касцюковіцкага** сельсавета, падпісчыкі атрымліваюць газеты вельмі рэдка, бо яны не дастаўляюцца непасрэдна падпісчыкам.

Выпісаныя **Касцюковіцкім** сельскажыўтаварыствам газеты для продажа ў розніцу ляжаць у сельсавеце па 5-6 дзён і пакуль трапяць у таварыства, іх застаецца толькі палова.

Вёскі **Ляшчаны, Кабыльшчыны, Шаткаўскага** сельсавета, знаходзяцца за 3 кіламетры ад паштовага агенцтва. У вёсках ёсць 2 калгасы, 2 школы, узімку тут працуюць звыш 60 чал. лесарубаў. Тым часам газет тут амаль зусім не ўбачыш. Загадчык **Шаткаўскага** паштовага агенцтва лічыць гэта нармальным і не думае правесці падпіску па газеты і наладзіць іх дастаўку.

У **Брэдаўскім** сельсавеце калгасныя лістаносцы ігнаруюць адназасобнікаў, не разносяць ім газет і лістоў. Гэта прывяло да таго, што большасць працоўных адназасобнікаў гэтага сельсавета не выпісвае газет.

Аб гэтым добра ведае старшыня сельсавета **Кузанозіч**, але ніякіх мер не прымае.

Па гэтых-жа прычынах не выпісваюць газет і адназасобнікі вёскі **Брэдны, Вялікастахаўскага** сельсавета. Настаўнік Брэдаўскай школы вымушан хадзіць за 9 кіламетраў у паштовае агенцтва, каб атрымаць свае газеты.

Паштовы куст **Лошніца** абслугоўвае 5 сельсветаў: **Навасельскі, Зачыйскі, Вяліканемаўскі, Метчанскі і Лошніцкі.** З-за бяздзейнасці кіраўніцтва дастаўка пошты ў гэтых сельсветах не арганізавана.

Не рэдкі выпадкі, калі падпіска зусім прападае. Рабочыя фабрыкі **«Бярэзіна»** на кастрычнік гэтага года правялі калектыўную падпіску на газету **«Звязда»** і часопісь **«Большэвік Беларусі»**, але і да гэтага часу не атрымалі ні аднаго экземпляра. Лістаносец **Суднік** сабраные на падпіску грошы прысвоіў.

Прыклад бюракратычна-чыноўніцкіх адносін да працы паказвае само кіраўніцтва Барысаўскага райаддзела **Саюздруку і сувязі.** У райаддзеле сувязі **10** дзён (з **10** па **21** лістапада) стаяў мяшок з газетамі і часопісамі для **Кішчына—Слабодскага** сельсавета. Засыпка газет і лістоў тут лічыцца звычайным з'явішчам.

Апарат райаддзела сувязі засмечан класава-варожымі элементамі. Работнік кёўска Нова Барысава **Кішэла**—былы ганцляр. Загадчык аддзела рознічнага продажа газет і часопісаў **Ліберман** паходзіць з духавенства, быў зволен з работы ў Барысаўскай цэнтральнай бібліятэцы за развал работы. **Суднік Я.** таксама мае цёмнае «мінулае».

Упаўнаважанаму Наркамсувязі трэба заціжавіцца складам апарата і работай Барысаўскай пошты і прыняць тэрміновыя меры па арганізацыі падпіскі і паляпшэнню дастаўкі газет і часопісаў у раёне.

Касарэўскі.

Разбіць сямейнасць і кругавую паруку

(Ліст служачага)

ГЛУСКІ паспрамгас павінен забяспечыць у гэтым годзе апалам капя 10 буйнейшых прадпрыемстваў горада Мінска (завод імя Варашылава, «Ударнік» «Комунар», «Пролетарый», фабрыкі імя Тэльмана, Кагановіча, «Кастрычнік», «Першае мая» і інш.). У мэтах фарсавання адгрузкі дроў кожнае з гэтых прадпрыемстваў камандыравала ў паспрамгас сваіх прадстаўнікоў. Аднак заметнага зруху ў гэтай справе не зроблена. Адгружана зусім нязначная колькасць дроў.

План IV квартала па загатоўцы будаўнічых матэрыялаў на сёння выкананы на 54,5 проц., па вывазцы на 19,4 проц. Загатоўлена дроў 64,9 проц. задання, вывезена-ж толькі 53,4 проц.

Прычына зрыва плана IV квартала крыецца перш за ўсё ў самім кіраўніцтве паспрамгаса. Дырэктар БАЯРЧАНКА — былы кулак. Да 1926 года ён меў кулацкую гаспадарку, у якой увесь час трымаў батракоў. Утаіўшы сваё социяльнае пахсджанне, ён прапез нават у рады КП(б)Б і толькі за раз, пры чыстцы партыйнай ячэйкі ЛПГ, выяўлен яго сапраўдны твар.

Баярчанка не толькі не мабілізуе апарат паспрамгаса на паспяховае выкананне плана посазагатовак і вывозкі, а сваёй дзейнасцю зрывае ўсю работу.

Кіраўніцтва буйнейшымі і адказнымі прарабскімі ўчасткамі даручана чужакам. Прарабам ЛЯСКОВІЦКАГА ўчастка напрыклад да апошняга часу працаваў сын памешчыка КАЛЕНДА. Уся работа на гэтым участку безумоўна сарвана.

Уласны транспарт паспрамгаса зна ходзіцца ў руках класавага ворага. Старшым конюхам на ЗЕЛЯНКОВІЦКІМ участку працуе былы спекулянт БАБОК, які зусім надаўна ганцляваў салам. Выдача кармоў коням (авёс, сена і інш.) праводзіцца без усякага кантроля. Гэтай справай ведае БАБОК, якому даручаны нават ключы ад свірна.

Дрэнныя бытавыя ўмовы (адсутнасць пасцельных прыналежнасцей ў інтэрнатах, бруд, холад) выклікалі вялікую цякучасць рабочай сілы транспарта.

На гэтым-жа ўчастку працуе ЛУКАШЭВІЧ. За разбазарванне хлеба-фуража ў мінулым годзе пастановай РКК РСІ ён быў знят з работы. Дырэктар паспрамгаса БАЯРЧАНКА ўзяў яго пад сваю апеку і даручыў загадван не транспартам на ўчастку. Лукашэвіч займаецца чым толька хочаце, але не паляпшэннем работы транспарта. З 40 коняй, якія ёсць, значная частка выведзена са строя. Ён сістэматычна п'янствуе і па некалькі дзён не бывае на канюшні.

Самаснабжэнне ў Глускім паспрамгасе ўвайшло ў сістэму. Веснавая сяўба гэтага года праведзена выключна на карысць кіраўнікоў ЛПГ, У ЗЕЛЯНКОВІЦКІМ і СЛАЎКАВІЦКІМ прарабскіх участках, насеннем, коньмі і на гнеі паспрамгаса праводзілася сяўба бульбы для дырэктара БАЯРЧАНКІ, сакратара парт'ячэйкі ВІНАГРАДАВА, планавіка АРХІПЦОВА, начальніка АРС КАВАЛЁВА, на месніка дырэктара КІРЫЛАВА, бухгалтара ЦЫРКІНА і інш. Агульны план веснавой сяўбы па паспрамгасу сорван.

Трэба спадзявацца, што трэст Лесбел зробіць адпаведныя арганізацыйныя высновы па гэтаму лісту і забяспечыць магчымасць поўнага выканання планаў посазагатоўкі і вывозкі па Глускаму паспрамгасу. БЫВАЛЫ.

Да віцебскай партканферэнцыі

ЗАМАЦАВАЎШЫ ДАСЯГНУТАЕ, ЗМАГАЦЦА ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ, ЗА ПОЎНУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ НЕДАХОПАЎ

Г. ШАПІРА

Сакратар парт'ячэйкі віцебскага алейнага завода

УНІКАЕМ У „ДРОБЯЗІ", У ДЭТАЛІ РАБОТЫ

Пасля 16 з'езда партыі пачалі будаваць наш завод. Я прыбыў на завод у самы разгар пускавога перыяда. Ячэйка была з 4-х комуністаў: Валдановец, Алашкоўскі, Шморыш і я. Перад намі стаяла задача — аўладаць вытворчасцю. Старых кадраў не было прыходзілася літаральна вучыцца на сваёй уласнай рабоце. Два месяцы пралаўжаўся пуск завода, ночы праседжвалі комуністы, галава трашчала. Прыяжджалі чыя спецыялісты на месяцах сядзелі (Васільеў, Нікалаеў) на заводзе, ламалі галаву, але нічога не выходзіла, варштаты не працавалі.

— Нічога не будзе, — заяўлялі яны, — аўтаматычны размеркавальнік Фрэнча не пойдзе.

Трэба яго замяніць старымі дапаможнымі размеркавальнікамі.

Перайсці на стары размеркавальнік ні ў якім разе мы не маглі згадзіцца. Існаваў вялікі разрыў паміж асобнымі агрэгатамі. Масы перамолатага ільнанасення адставалі, вальцовачныя смолкі давалі буйны памол. Выхад масла ледзь-ледзь дахоліў да 25 проц.

Ныцік Камароў, кандыдат партыі, заяўляў:

— Завод не будзе працаваць. Пой дзем на стары завод імя Калініна. Камароў згуртаваў кулацкую групу (Радзівонава, Багаценка і Пістуновіча), якая выступала супроць адзельнай працы, супроць нормы.

Кулацкі агітатар Камароў быў выключан з партыі. Па патрабаванню рабочых Радзівонаў, Багаценка і Пістуновіч былі зволены з завода.

У барацьбе за асваенне, за аўладанне праектнай магутнасцю ўзрастала, мацнела партарганізацыя завода. Вось комуніст Бялевіч — былы ламавы возчык. Ён паказаў сябе сапраўдным ударнікам. Пяцёра ў плячо ён працаваў з дарадчыкам Бушуевым і вучыўся ў яго. Зараз Бялевіч вылучанец. Ён кіруе грамадскім харчаваннем на пяцігодка-трыкатажнай фабрыцы імя Клары Цэткін.

Такіх Бялевічаў заводская партячэйка выхавала шмат. Усе яны прайшлі вялікую школу барацьбы за асваенне завода. Комуніст Шмарыш, беспартыйны рабочы Міркін па сутках сядзелі і вывучалі прычыны, чаму не рухаюцца аўтаматы.

Нарэшце, раскрылі сакрэт.

— Бачыце, гэты клапан, — гаворыць Міркін да дырэктара Валапосава, — у ім няправільная разьба, а гэта «дробязь» не пускае ў ход нашы аўтаматы.

Завод пусцілі.

11 гадзін раніцы 9 снежня 1933 года. У цэхах мітынг.

— Сёння выканана галавая праграма. На паўдарозе не спыняцца, к 15 з'езду КП(б)Б і 17 з'езду ВКП(б) даць звыш плана 200 тон алею, 600 тон макухі, 400 тон аліфы.

Вось заклік нашай парт'ячэйкі.

— Ёсць, — заявілі рабочыя. За словам паследвалі справы. Па 20-е снежня дана звыш плана 212 тон алею, 485 тон жмых, аліфы 450 тон.

Бушуеў Алесь — парторг брыгады № 1. У яго заўсёды план перавыконваецца як па колькасці, так і па якасці. Штодзённа ў яго некалькі мінут — вытворчыя нарады. Бушуеў спыніў выпуск брака. І за раз брыгада Бушуева нясе імя 17 з'езда партыі.

Купер Рудольф, парторг брыгадзіра брыгады № 2. Ён арганізаваў брыгаду з некваліфікаваных рабочых і вучыць іх працаваць. Брыгада ўвесь час выконвае прамфінплан, дае высокаякасны алей і макуху. Тав. Купер у 1931 годзе ўступіў у партыю. Ён добры рацыяналізатар і вынаходца, прэміяван некалькі раз.

Партыйная арганізацыя кіруе работай кожнага свайго члена. Індывідуальныя справаздачы на бюро, на адкрытых сходах, кароткія нарады, індывідуальныя гутаркі і нарады з кожным — вось асноўны метад жывога кіраўніцтва. Усе члены ячэйкі ахоплены партвучобай. Больш 50 проц. рабочых — 80 чал., у тым ліку і ўсе комуністы, ахоплены тэхнічнай вучобай. Замест планавай астачы алею ў макусе 7 проц., завод дае 6,6 проц. Гэта значыць, што завод дадаткова дае дзяржаве 36 тон алею. Перад намі зараз стаіць задача — палепшыць санітарнае становішча на заводзе, бо з гэтай справай у нас абстаіць не зусім добра. З гэтай задачай мы справімся.

БАРАНОУСКАЯ АЛЯКСАНДРА

Работніца-ўдарніца фабрыкі „Дзвіна"

ІНАКШ ПРАЦУЕМ, ІНАКШ ЖЫВЕМ

Манастыр і пустыр — вось як выглядзела Маркаўшчына, калі я ў 1903 годзе пастуціла працаваць на фабрыку «Дзвіна». 12-гадовай дзяўчынкай я прымушана была пайсці на цяжкую працу.

Цяжка было працаваць, і яшчэ горш жыць. Мой рабочы дзень складаў роўна 18 гадзін, за якія мне плацілі 30 і самае большае—35 кап. Яшчэ больш пагоршылася маё жыццё, калі я абзавялася сям'ёй. За гэтыя-ж грошы я прымушана была карміць трох чалавек. У хаце цемра, голад, холад.

Мы не маўчалі. Мы выходзілі на вуліцу з чырвонымі сцягамі, патрабавалі надбаўкі, і атрымалі... плёткі і турму. Наша старая прадзільніца Рыбакова Наташа так у турме і згніла.

А цяпер, самі бачыце, не пазнаць нашай старой Маркаўшчыны. Фабрыкі, заводы, школы, клубы, больніцы—усё гэта дала нам толькі совецкая ўлада. Цяпер мы ведаем за што працуем. Не на пана Труме, які доўгія годы высмоктваў нашу кроў — мы працуем. А на самых сябе, на сваіх дзяцей.

І працуем мы не як-небудзь, а па-ўдарнаму. Вось я асабіста, не тлеючы на свае 40 год, абслугоўваю двухватэрныя машыны. Замест 10 з'ёмаў прадзіва штодзённа снімаю па 11 і 12. Мая работа — гэта поўныя 420 мінут.

Але выканаць колькасныя паказальнікі праграфінплана — гэта яшчэ не ўсё. Галоўнае — гэта якасць. І на гэтым участку я, як старая работніца, заўсёды паказваю лепшыя прыклады. Маё прадзіва—самае лепшае на фабрыцы, і гэтым я асабліва ганаруся.

Я ганаруся таксама і тым, што навучыла прадзільнай справе шмат маладых, зусім некваліфікаваных работніц. Чаплінская Даша, якая прайшла маю школу, і шмат іншых таварышоў зараз з'яўляюцца лепшымі ўдарніцамі ватэрштыцамі.

Мая машына заўсёды ў належным парадку. Тры разы ў змену я абавязкова раблю чыстку машын і змазку верацён. Акрамя таго, што кожны месяц мы робім капітальную брыгадную чыстку машын.

Мае годы ўжо не малацыя, але на працы я адчуваю сябе вусім маладой, бадзёрай. Я нават выклікала на соцпаборніцтва т. т. Нікіціну, Пруднікаву і Грышанаву. Уся наша брыгада «Чырвоны ватэрштычык» спаборнічае з участкам Селязнёвай. У нашай брыгадзе ёсць сапраўдныя ўдарніцы, як Дрэздова Фёкла, Салаўёва Усціна і Чаплінская Даша. Дзякуючы такім ударнікам наша брыгада сістэматычна выконвае сваю вытворчую праграму.

Мая ўдарная работа належным чынам і аплочваецца. Мой месячны заработак складае 150-160 рублёў. Знаходжуся на ўлічыльным стане, як герой пяцігодкі і герой працы, акрамя свайго рабочага пайка атрымліваю дадаткова і спецыяльны паёк—мяса, ветчыну, цукар і іншыя прадукты. За сваю ўдарную работу я ўжо пяць раз прэміявана ганарэвымі граматамі, грашыма і прэмтаварамі.

Непазнавальным стала маё жыццё. У хаце — электрычнасць, новая шафа. Я і мае дзеці сытыя, адзеты і абуты. Сын мой Іван працуе на новай мяблевай фабрыцы і зарабляе 200 руб. у месяц. І асабліва я ганаруся тым, што дачка мая скончыла семігодку і зараз займаецца ў педінстытуце, аб чым я ў мінулыя гады і марыць не магла. Сама я таксама наведваю кандыдацкую школу.

Змяніла свой твар Маркаўшчына. Змянілася праца, змянілася і маё жыццё.

ШЭЙДЗІН

Інжынер фанернага завода імя „Звязды"

АСВОЙВАЕМ ТЭХНІКУ ВЫТВОРЧАСЦІ

На віцебскім фанерным заводзе імя «Звязды» я ў якасці інжынера-тэхніка працую з ліпеня 1931 года. За год да гэтага я скончыў ленінградскую лясную акадэмію.

Што я знайшоў на заводзе?

Тэхнічнае становішча абсталявання — ніжэй усякай крытыкі. Поўная адсутнасць нагляда за рамонтам. Ні адной запасной часткі. Паміж цэхамі не было патрэбнай увязкі. Дысцыпліна культала на абедзве нагі.

Выхаваны совецкай уладай, навучыўшыся за совецкія грошы, я паставіў сабе задачай поўнасцю апраўдаць затрачаныя на мяне сродкі.

Хутка арыентаваўшыся ў агульным станавішчы завода, я з вялікай актыўнасцю ўзяўся за работу. Галоўную ўвагу я накіраваў на механічны цэх — сэрца завода. З дапамогай лепшых ударнікаў — механіка **Бронзва**, яго памочніка **Кабанава**, слесароў т.т. **Скумана і Казакова** і інш. намі быў арганізаван парк запасных частак, канчаткова ліквідавана абшалічка ў рабоце слесароў, выпрацавана прэміяльная аплата для дзяжурных слесароў, баручы ў аснову зніжэнне прастояў, эканомію паліва. Устанавілі жорсткую дысцыпліну.

Хуткае прыстасаванне да ўмоў завода пастаноў партыі і ўрада аб Дамбасе і чыгуначным транспарце адыграла велізарную ролю ў датэрміновым выкананні заводам сваёй гадавой праграмы.

З 34 работнікаў ІТР 16 чалавек былі перакінуты з заводакіраўніцтва ў ліны — цэх, брыгаду, участак. Былыя майстры завода — **Дамрацкі, Манойка і Ефімаў** — былі перакінуты на работу ў якасці брыгадзіраў. Былы планавік завода **Градзюшка** прызначан дзяжурным майстрам і т. д. Апарат гэтага ўсе члены ІТР прымацаваны да гаспадарча-разрахункавых брыгад. Гэтыя мерапрыемствы ўзмацнілі спрэдзіце і нізавое вытворчае звяно.

Ведзіарная работа праведзена на заводзе ў сэнсе ўкаранення тэхнічных ведаў сярод рабочых. Згодна загада Наркамлеса мы павінны былі ў абавязковым парадку навучыць тэхмінімуму 23 рабочых, а фактычна мы навучылі 106 чалавек, працуючых на асноўных працэсах—лушчыльным, сартавальным, клеяварным цэхах. Зараз пры заводзе працуе вячэрняя рабочая школа з спецыяльным ухілам па фанерай вытворчасці. Таксама ідзе падрыхтоўка па ўкараненню тэхведаў, ад курса тэхмінімума да курса тэхмаксімума.

Шмат увагі мы аддаем рацыяналізацыі вытворчасці. Мною рэканструявана топка катла «Фішэр» і «Гам пор», што дало магчымасць нашаму заводу абыйсціся без прывознага паліва. Пам. механіка Кабанаў і слесар Скуман вырабілі спецыяльны спіральны варштат для пачынкі фанеры. Пам. тэхкіраўніка т. Дамбе сваёй прапановай па сухому клееваму прэсу павялічыў прадукцыйнасць прэса на 50 проц.

Дабіўшыся пад кіраўніцтвам парт арганізацыі бліскучай перамогі — датэрміновага выканання гадавога прамфінплана, — увесь наш інжынерна-тэхнічны персанал гатоў яшчэ з большай актыўнасцю і творчым энтузіязмам змагацца за прамфінплан у другім годзе 2-й пяцігодкі.

гайшай ступені недысцыплінаванасці, дэзарганізуе усю работу групы. Выключаўся са школы, потым быў зноў адноўлен гарАНА. Бацька, выкліканы ў школу, на просьбу настаўніка дапаматчы арабіць уплыў на свайго сына адказвае: «Гэта ваш абавязак, я-ж вас да сабе дамоў не выклікаю, спраўляюся сам».

Так адказаць мог толькі чыгуна, але не большэвік.

Або вось другі факт: Фіалкоўскі, вучань 3-й групы 33 школы, сваёма срывае усе школьныя мерапрыемствы, не хоча вучыцца, пачынае часта бойкі з таварышамі. Бацька — палітэмігрант, у школе ні разу не быў. Калі загалчыца школай вымушана была найсці да Фіалкоўскага дамоў і гутарыць з ім адносна яго сына, ён заяў а сябе ўсякую адказнасць за яго. «За выхаванне дзяцей я не адказваю» — гаворыць гэты заядлы бюракрат. Дзе гэта ў праграме або статуце нашай партыі сказана, што бацькі не адказваюць за дзяцей? Адкуль узяў гэту высокамернасць комуніст Фіалкоўскі, ці нельга заклікаць да парадка гэтых бацькоў, калі яны самі не разумеюць сваіх абавязкаў у адносінах да дзяцей?

Сын комуніста Міллера, вучань IV групы 33 школы, недысцыплінаваны, не хоча займацца. Не гледзячы на самыя настойлівыя запрашэнні адміністрацыі, бацька ні разу не з'явіўся ў школу.

Комуніст Глікін, бацька вучня IV групы 3-й ФЗС, выбран у школы камісіяй гэтай школы, але ігнорыруе свае абавязкамі, у школе ніколі не бывае.

Талкачоў — вучань 2-й групы 3-й ФЗС. У школе буйнь: раскатваецца часта, надсяўшыся на трамваі. Бацька — работнік ЦКК-РСІ. У школу таксама школі не заглядае.

У 26 ФЗС вучань VII групы, сын комуніста Ермакова ў часе Окцябрскіх свят з'явіўся п'яным у школу разам з некалькімі вучнямі, і ўчыніў дэбош. Ермакоў — былы рэктар БДУ, цяпер послан начальнікам палітаддзела МТС. Аводы і бацька і малі педагогі па прафесіі, а выхаваннем свайго сына не заняліся.

У IV групе 2-й школы вучыцца сын аднаго вельмі адказнага работніка. Хлопчык бясчынствуе. На ўроках свішча, вольна разгульвае па класу, прыходзіць і выходзіць са школы калі хоча. Заводзіць часта бойкі, падбухторвае большых дзяцей на меншых. Вучыцца вельмі кепска. Кіраўніца групы два разы была ў яго дома, але, не гледзячы на гэта, ні бацька, ні маці ў школу ні разу не заглянулі. Вучні гэтай групы, дзе ён вучыцца, абавязалі свой групавы совет напісаць асабісты ліст бацьку-комуністу, у якім рашылі прасіць яго сумеснымі намаганнямі выправіць сына. Вось што пішуць дзеці:

«Дарагі тав. «Н.» Групавы совет 4-й групы другой ФЗД ад імя вучняў усяго класа просіць Вас дапамагчы нам у справе выпраўлення паводзін вашага сына Владзіміра. Ваш сын Владзімір разлагае дысцыпліну ў нашай групе і наогул ва ўсёй школе. У часе заняткаў ён нічога не слухае і да лекцый зусім не рыхтуецца. Адсюль і адказы ў яго нездавальняючыя. На перапынках ён дазваляе сабе біць вучняў і плярацца. За ім мы ўчора заўважылі, што ён узяў у вучаніцы Шапоко без яе дазвола спірку і не хацеў аддаць. Калі настаўніца запытала ў вучняў, хто ўзяў спірку, дык ён нават не прызнаўся, і калі заўважылі ў яго руках спірку, тады толькі ён яе аддаў. У часе лекцый ён таксама срывае дысцыпліну, плюецца, свішча і нават б'ецца. Адносіны да школьнай маемасці таксама вельмі дрэнныя. Паламаў яшчык, у якім мы хаваем чарнільніцы. З ім гутарылі — настаўніца, загадчык вучэбнай часткай і загадчык школай. Але гэта не аказвае на яго ніякага ўплыву. Сваімі паводзінамі і адносінамі да работы ён не дае магчымасці выконваць пастанову ЦК аб школе, якая патрабуе ад нас свядомай дысцыпліны і добрай вучобы».

Старшыня групавога совета **(ЛЕВІНА Р.)**

Сакратар групавога совета **(ГАРЭЛІК Л.)**

Дзіцячы калектыў патрабуе ўвагі і дапамогі школе з боку сям'і, дапамогі ў выпраўленні асобных недысцыплінаваных дзяцей. Гэты ліст павінен прымусіць бацькоў—комуністаў, бацькоў — рабочых сур'ёзна прыздумацца над гэтым. Напэўна тав. Н. ліст атрымаў і дапаможа школе ў выпраўленні дзіцяці, зробіць так, каб вучні яшчэ раз пераканаліся ў тым, што комуністы стаяць на варце інтарэсаў школы, што яны моцна змагаюцца за дырэктывы ЦК аб школе. Калі-ж ён гэтага не зробіць, то цытанне аб уздзейнасці на гэтага таварыша безумоўна стане ў ЦК.

У 4-й школе (Менск) навучаецца 1.600 дзяцей, сярод іх многа дзяцей комуністаў, адказных работнікаў, а з выбраных у камсод 6 членаў партыі ні адзін не працуе. Таварышы **Зэлькіна, Рэсіна, Фіш** і інш. не лічаць сваім партыйным абавязкам кіраваць работай сярод бацькоў, наблізіць сям'ю дзіцяці да школы, забяспечыць сумеснымі намаганнямі палітычнае выхаванне яго. У школе ёсць 18 піонер-атрадаў, з якіх толькі 7 забяспечаны важатымі, ды і то большасць з іх свае-ж вучні. Комсамольскі калектыў друкарні імя Сталіна, да якой школа прымацавана, не клапоціцца аб важатых. Комсамольская ячэйка 4-й школы, налічваючая 12 маладых комсамольцаў, не мае партпрымацаванага.

Як-жа назваць на палітычнай мове такія адносіны з боку комуністаў-бацькоў да пытанняў дапамогі школе, сумеснай работы са школай? Палітычна гэта безумоўна азначае недаацэнку нашага «заўтра», неўразуменне таго, што нашы дзеці, совецкія дзеці, выхаваныя намі ў комуністычным духу — наша будучае.

Наяўнасць прарываў у выхаваўчай рабоце школ радуе раёнаў, вялікі недахоп піонер-работнікаў, адсутнасць сістэматычнай глыбокай работы па павышэнню палітычнага ўзроўня і кваліфікацыі піонер-работнікаў сведчаць таксама аб тым, што з боку комсамольскай арганізацыі яна яшчэ на сёння ў належнай ступені патрэбнай увагі і дапамогі школе. Ленінскі комсамол Беларусі — лепшая школа інтэрнацыянальнага выхавання маладых рабочых і сялян — павінен па-баявому пераключыцца на сапраўднае ажыццяўленне шефства над школай.

Комсамольцы—застрэльшчыкі соцпаборніцтва, адольныя гераічна змагацца на ралае ўчасткаў соцыялістычнага будаўніцтва, павінны заняцца выхаваннем сваіх малодшых дзяцей па класу, павінны забяспечыць узмацненне выхаваўчай работы ў піонер-атрадзе, у ўзмацненне, павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўня піонер-арганізацыі.

«Інтэрнацыяналізм з'яўляецца асноўнай ідэяй, пранізваючай усю работу комсамола. У гэтым яго сіла. У гэтым яго моц. Трэба, каб дух інтэрнацыяналізма заўсёды вітаў над комсамолам» — гаворыць т. **Сталін.** Гэтай сваёй сілай комсамол павінен зарадзіць кожнага піонера, кожнага вучня. Трэба па-баявому, закасаўшы рукавы, узяцца за ўзмацненне інтэрнацыянальнага выхавання дзяцей, па-большэвіцку змагаючыся на два фронты са скажэннем генеральнай лініі партыі ў нацыянальным пытанні, а мясцовым нацыяналізмам, як галоўнай небяспекай на даным этапе, не дазваляючы барацьбы супроць далікадзя[illegible] [illegible]ага шавінізма.

Да XV партыйнага з'езда Беларусі, XVII усесаюзнага партз'езда не павінна застацца ні аднаго піонер-атрада без моцнага комсамольскага важатага, ні адной школьнай комсамольскай ячэйкі, без кіраўніцтва камітэтаў комсамола.

Слаўны XV-гадовы юбіляр — ленінскі комсамол Беларусі — пад кіраўніцтвам КП(б)Б пакажа і на гэтым адказнейшым участку ідэалагічнага фронта ўменне змагацца за генеральную лінію партыі.

Наша масавая школа моцна расце і гэты ўзмоцнены рост патрабуе яшчэ большай мабілізацыі ўсёй партыйнай і пролетарскай грамадскасці на большую, так патрэбную, канкрэтную дапамогу школе.

Кожная КК-РСІ павінна стаць сапраўды пільным вокам партыі ў справе праверкі і кантроля выканання гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) аб масавай школе.

Партыйныя, комсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі, органы народнай асветы павінны мабілізаваць усе магчымасці для баявога вырашэння пытанняў жыцця школы ў напрамку паляпшэння якасці вучобы, узмацнення класавага інтэрнацыянальнага выхавання дзяцей, максімальнага прыцягнення пролетарскай і калгаснай грамадскасці і непасрэднага ўцягвання бацькоў-рабочых і калгаснікаў ва ўсю работу школ.

Комуністы-бацькі абавязаны быць перадавікамі ў гэтай справе.

Кожная заводская і калгасная партыйная ячэйка, комсамольская ячэйка абавязаны па-большэвіцку мабілізавацца на справу асветы і выхавання дзяцей, лічачы для кожнага партыйца і комсамольца яго партыйным і комсамольскім абавязкам прымаць удзел у найвялікшай палітычнай важнасці справе — навучанні і выхаванні дзяцей.

З усёй большэвіцкай энергіяй і капрыстасцю будзе [illegible] за ленінскае выхаванне [illegible] барацьбі тоў за комунізм. [illegible] выхаванне, «здольнае канчаткова устанавіць комунізм».

ТЭЛЕГРАМЫ

„МАНЧЭСТЭР ГАРДЫЯН" АБ ТЭЗІСАХ К XVII ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ

ЛОНДАН, 6 студзеня (БЕЛТА).

«Манчэстэр гардыян» публікуе паведамленне свайго маскоўскага карэспандэнта, у якім рэзюмуе змест тэзісаў даклада тав. Кагановіча к 17 партз'езду.

Карэспандэнт падкрэслівае важнае значэнне арганізацыйных мер, у прыватнасці, указвае, што ў тэзісах робіцца вялікі ўпор на павышэнне індывідуальнай адказнасці.

Заяўляючы далей, што доступ у партыю «будзе зроблен больш заскруднёным», карэспандэнт піша:

«Класавы прынцып пры прыёме новых членаў захаваецца — прамысловыя рабочыя прымаюцца з вялікай гатоўнасцю, а служачыя і інтэлігенты — з вялікімі абмежаваннямі».

Газета публікуе таксама паведамленне агенцтва Рэйтар аб праграме другой пяцігодкі, якая, паводле слоў газеты, разлічана на тое, каб «ператварыць Совецкі Саюз у прамысловага суперніка яго найбольш магутных капіталістычных суседзяў».

„ЯПОНІЯ ПЕРАЖЫВАЕ САПРАЎДНЫ КАШМАР"
ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА ЯПОНІІ Ў АЦЭНЦЫ „ТАН"

ПАРЫЖ, 6 студзеня. (БЕЛТА).

Японскі карэспандэнт «Тан» паведамляе, што эканоміка Японіі параслна да самых асноў. «Японія перажывае сапраўдны кашмар. Эканамічныя, фінансавыя і палітычныя труднасці настолькі сур'ёзны, што пагражаюць усяму будынку, не гледзячы на яго бліскучы фасад».

УРАДАВЫ КРЫЗІС У РУМЫНІІ

ВЕНА, 6 студзеня. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Бухарэста, Ты тулеску адхіліў прапанову ўвайсці ў склад новага румынскага габінета. Новы прэм'ер Татарэску, які з'яўляецца міністрам замежных спраў, заявіў у дэкларацыі, што габінет будзе прадаўжаць палітыку ўрада Дука і паляпшаць усякую тарарыстычную дзейнасць.

ПАГІБЕЛЬ 142 ЧЭХАСЛАВАЦКІХ ГАРНЯКОЎ

ПРАГА, 6 студзеня. (БЕЛТА).

Усе шахты прадпрыемства «Недысон», каля Оссека, у якіх адбыўся выбух, забіты для папярэджання пашырэння ўдушлівых газаў. Тым самым вырашан лёс 142 зажыва пахаваных гарнякоў.

1.300.000...



Высокая бронзавая фігура Ільіча з парывіста ўзнятай рукой. Праменні асыпаюць п'едэстал і мазаічную падлогу вестыбюля.

Угару бягуць уходцы. Па іх штодня праходзяць людзі з заклапочаным, сур'ёзным выглядам, са сшыткамі, са скруткамі паперы.

Ідуць рабочыя з «Большэвіка», «Комунара», завода імя Варашылава, працаўнікі Акадэміі навук, студэнты БДУ, палітэхнічнага і педагагічнага інстытутаў, вучнёўская моладзь тэхнікумаў і школ Менска.

З 9-ці гадзін раніцы габінеты, чытальні дзяржаўнай бібліятэкі БССР поўняцца народам. Да вечара 800-900 чалавек праходзяць праз яе прасторныя, светлыя пакоі з незлічонымі паліцамі кніг.

Тут вывучаюць Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, рыюцца ў энцыклапедыях, праглядаюць найноўшыя журналы—узбройваюцца тэорыяй, авалодваюць ведамі.

У хуткім часе нашай дзяржаўнай бібліятэцы спаўняецца 12 год. Окладаны і даўгі шлях паступовага ўзбагачэння кніжнага фонда, апрацоўкі кожнага выдання, сістэматызацыі прайшла яна, перш чым накапіць 1.300.000 томаў і перайсці ў адзін з лепшых будынкаў чырвонай сталіцы БССР!

Заснаваная ў 1922 годзе, як універсітэцкая, з 30 тысячамі кніг, дзяржаўная бібліятэка мела ўжо ў пачатку першай пяцігодкі 500 тысяч, а на 1 студзеня 1932 г.—мільён томаў.

У значнай меры дзякуючы выключнай энергіі і стараанням нязмен нага дырэктара бібліятэкі тав. **СІМА НОЎСКАГА** яна ўзбагацілася радам каштоўнейшых бібліяграфічных укладаў. Бібліятэка на працягу амаль дзесяці год атрымлівае абавязковы экземпляр з усіх друкарань і выдавецтваў Саюза. Бязупынным канвеерам паступаюць у яе кнігасховы дзесяткі тысяч кніжак па самых рознастайных пытаннях літаратуры, навукі, мастацтва.

Зараз у блакітна-шэраватым будынку на Чырвонаармейскай—цэлы кніжны камбінат: Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна, кніжная палата, падзвычай багатыя аддзелы польскай і яўрэйскай кнігі, якія маюць усесаюзнае значэнне, канцэнтруючы ўсе выданні на гэтых мовах, выходзячыя ў СССР.

У гэтым камбінаце—агульная чытальня на 400 чалавек з габінетамі для навуковых работнікаў і аспірантаў, аддзел і чытальня тэхнікі, совецкага будаўніцтва, чытальня і сталая выстаўка перыядычных выданняў, бюро рэкамендацыйнай бібліяграфіі, аддзел масавай работы, даведачна-бібліяграфічны і аддзел міжбібліятэчнага абанемента.

...Вось да круглага століка пра цаўніцы агульнай чытальні, жвавай дзяўчынкі, падыходзіць пажылы рабочы завода «Большэвік». Яго цікавіць навейшая літаратура на дублёні скур, па тэхналогіі асноўных прац цэсаў на яго прадпрыемстве.

— Зараз!

Дзяўчынка запісвае некалькі назваў папулярных брашур і кніг на асобны лісток—патрабаванне. Праз 3-4 хвіліны патрабаванне задаволена і слупок брашур—у наведвальніка.

...Вось студэнт літфака просіць выдаць яму «Красное и черное» Стэндаля. Зноў—некалькі хвілін чакання і кніга з'яўляецца на стале. Улік і падача літаратуры з кнігасховаў наладжана добра.

Са сцяны аднаго з шырокіх калідораў бібліятэкі, з плаката гавораць словы Ільіча:

— «Бачыць гордасць і славу публічнай бібліятэкі не ў тым, колькі ў ёй маецца ратаскласай, колькі якіх-небудзь выданняў XVI стагоддзя, альбо рукапісаў X стагоддзя, але ў тым, як шырока абарачваюцца кнігі ў народзе, колькі прыцягнута новых чытачоў».

І ў практыцы дзяржаўнай бібліятэкі гэтая цытата абрастае поўнакроўнымі, жывымі справамі. Варта прасачыць за ростам ліку наведвальнікаў, чытачоў. У 1931 годзе бібліятэку наведала 74 тыс. чалавек, пастаянных чытачоў было зарэгістравана 3.759, выдана кніг 105 тыс. На наступны год гэтыя лічбы павялічыліся так: наведвальнікаў было 161 тыс., пастаянных чытачоў 9 тыс. і выдана кніг 280 тыс. За мінулы-ж 1933 год наведвальнікаў было 220 тыс., чытачоў 12 тыс., а кніг выдана звыш 300 тыс., апроч газет.

З 1-га студзеня пры бібліятэцы адкрылася вялікая выстаўка тэхнічнай кнігі. Яна ахапляе сабою ўсе галіны тэхнікі і народнай гаспадаркі. Літаратура, прадстаўленая на гэтай выстаўцы, дае магчымасць работчым, калгаснікам, вынаходцам, спецыялістам азнаёміцца з апошнімі навінамі навукі і тэхнікі. Буйнейшыя раздзелы выстаўкі—энергетыка, машынабудаўніцтва, металургія, будаўнічая, лясная, хімічная, тарфяная і іншая прамысловасць.

На выстаўцы апроч агульных пытанняў навукі і тэхнікі, кожную дэкаду дадаткова, пашырана прадстаўляюцца паасобныя галіны мясцовай прамысловасці (адпаведна планам экскурсій).

Да XV з'езда КП(б)Б дзяржаўная бібліятэка адкрывае свае аддзяленні ў Магілеве і Гомелі. У Віцебску такое аддзяленне ўжо існуе даўно.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў дзяржаўнай бібліятэкі на гэты год з'яўляецца арганізацыя самастойнага аддзялення пры Доме Ўрада. У выніку гэтага будзе створана цэнтральная ўрадавая бібліятэка, якая ўключыць у сябе раз'яднаныя дагэтуль бібліятэкі паасобных наркаматаў.

Сярод работнікаў бібліятэкі, якіх налічваецца 127 чал., нядрэнна працуе мясцком, разгортваецца палітычная вучоба, расце сетка гурткоў па павышэнню кваліфікацыі. Вырастае зусім новы тып бібліятэчнага работніка—грамадскага дзеяча, актывіста.

ЮР. ЛЯВОННЫ.

ПЕРШАЯ Ў БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б аб паляпшэнні культурна-бытавога і медычнага абслугоўвання навуковых работнікаў і студэнтаў—у дзеянні.

Новым практычным крокам у гэтай справе з'яўляецца адкрыццё паліклінікі-больніцы пры **ГОРАЦКІМ** с.-г. інстытуце. Паліклініка і больніца будуць абслугоўваць навуковых работнікаў і студэнтаў інстытута. Гэта — першая ў БССР паліклініка-больніца пры вышэйшай с.-г. навуковай установе.

Новая паліклініка-больніца мае цэлы рад спецыяльных габінетаў, абсталяваных навейшымі прыладамі, у тым ліку і электралячэбніцу.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

СНК БССР вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па разгортванню індывідуальнага рабочага агародніцтва ў 1934 годзе.

Да 20.000 рабочых Менска, Віцебска, Гомеля, Барысава і інш. пролетарскіх цэнтраў рэспублікі атрымаюць рэальную дапамогу ў арганізацыі невялікіх агародаў недалёка ад гарадоў, прадпрыемстваў, рабочых пасёлкаў.

СНК даручыў старшыням РВК, гарсоветаў разам з прафсаюзамі выз начыць канкрэтны план работы ў гэтай галіне, арыентуючыся на адвод зямлі пад індывідуальныя агароды ў памерах ад 1,8 да 1,4 га на рабочую сям'ю. Адвод зямель павінен быць скончан да 15 лютага, пры чым пры адводзе зямель масівамі павінна быць прадугледжана магчымасць стварэння ў будучым на гэтых участках дачных рабочых пасёлкаў.

Зямельныя ўчасткі, якія адводзяцца рабочым, замацоўваюцца за імі на 5-7 год пры ўмовах штогоднага скарыстання пад агародныя пасевы. Рабочыя, якія маюць участкі зямлі, занятыя пад пасевамі гародніх культур у гарадох і сельскіх мясцовасцях, вызваляюцца ад уплаты с.-г. падатка і т. д.

СНК даў рад указанняў ОРС'ам, Наркамзему, Наркамсоўгасаў, Белкаапсаюзу, Камітэту зататовак аб за бесплачэнні індывідуальнага рабочага агародніцтва насеннем агародніх культур і дробным інвентаром (лапаты, вілы, граблі, лейкі).

СНК абавязаў Белкаапсаюз і ОРС'ы аказваць агратэхнічную дапамогу рабочым у арганізацыі індывідуальнага агародніцтва.

На пасяджэнні СНК 5-га лютага будуць заслуханы даклады менскага, віцебскага і гомельскага гарсоветаў і 3-4 РВК аб ажыццяўленні гэтай пастановы.

У пастанове звернута ўвага кіраўнікоў гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый на тое, што разгортван не індывідуальнага рабочага агародніцтва ні ў якім разе не павінна аслабіць увагі рабочых да прыгарадных гаспадарак.

СНК БССР азнаёміўся з ходам асваення гомельскага шклазавода імя Сталіна і падрыхтоўкай работ да пуска другой сістэмы чаргі.

Завод не толькі не справіўся з планавымі заданнямі па вырабу гатовай прадукцыі, але ў снежні нават пагоршыў работу параўнальна з лістападам. Тэрмін пуска другой сістэмы агрэгатаў, устаноўлены ўрадам, сарваны.

Дырэкцыя завода (т.т. Горцаў, Дабравольскі) пераацанілі вынікі перыпых дзён работы завода і фактычна дэмабілізавалі рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны персанал. Не былі ўжыты неабходныя меры да замацавання рабочых газа-генератыўнага цэха, які займае рашаючае становішча на заводзе.

На заводзе вялікая цякучасць рабочай сілы, што з'яўляецца вынікам зрыва жыллёвага будаўніцтва. Сумы, адпушчаныя на гэту мэту, не выкарыстаны.

СНК БССР пастанавіў давесці да ведама наркома лёгкай прамысловасці СССР тав. Любімава аб становішчы на шклазаводзе, з просьбай заслухаць у бліжэйшым часе даклад дырэкцыі шклазавода з выклікам Наркамлегпрама БССР тав. Каца і прадстаўнікоў СНК.

За перабой ў падвозцы торфа дырэктару торфзавода «Большэвік», тав. Шулькоўскаму абвешчана суровая вымова, а дырэктару Белторфа тав. Кузняцову пастаўлена на від.

СНК даў рад указанняў камітэту па апалу, Белторфу, і торфазаводу «Большэвік» па неадкладнай ліквідацыі перабояў у снабжэнні шклазавода апалам.

Тэрмін пуска другой сістэмы агрэгатаў устаноўлен не пазней 15 лютага 1934 года.

Для арганізацыі прыгарадной гаспадаркі шклазавода імя Сталіна перадаецца соўгас «Старая Беліца», Уваравіцкага раёна.

ХРОНІКА

ДОМ-КОМУНА для старых большэвікоў — членаў беларускага аддзялення ўсесаюзнага таварыства будзе будавацца ў бягучым годзе ў дачнай мясцовасці Шэйнічы пад Менскам.

РАДЫ�ё-КУРСЫ для калгаснікаў на 40 чалавек адкрываюцца ў бліжэйшыя дні ў Менску.

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ імя гарсовета перадан менскай пажарнай ахове за добрую арганізацыю летняй прэ ціпажарнай кампаніі і актыўную дапамогу калгасам і соўгасам. За летні перыяд у калгасы і соўгасы накіравана 38 новых пажарных машын, арганізавана 38 дружын.

31 ДВУХПАВЯРХОВЫ СТАНДАРТНЫ ДОМ абавязаўся выпусціць датэрмінова да XVII з'езда ВКП(б) стандартны пэх бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната.

КЛЕЙ «МІНЕРАЛ», які замяняе сталярны клей у дрэваапрацоўчай, паліграфічнай і галантарэйнай вытворчасці, вынайшоў работнік завода «Большэвік» тав. **ШЭР.** Клей «Мінерал» значна танейшы за сталярны (15 кап. кілаграм).

ФЕЛЬЧАРСКІЯ ПУНКТЫ і доктарскія ўчасткі будуць адкрыты ў найбольш буйных соўгасах і ажкормачных пунктах Белкаапсаюза, НКЦяжпрома і інш. арганізацый. У першым паўгоддзі бягучага года па лініі НКЗема будзе праведзена перападрыхтоўка 30 раённых ветэрынарных інспектароў.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ НАВІНЫ

У бліжэйшыя дні ў Менску пачнуцца гастролі харкаўскага яўрэйскага тэатра малых форм. Тэатр пакажа па рабочых клубах п'есы: «Чырвоная кавалерыя», «Хто каго», «Прарыў» і т. д.

Першы менскі тэатр рабочай моладзі працуе зараз над класічнай п'есай Мольера «Тарцюф». П'еса перакладзена на беларускую мову К. Крапівой. Пастаноўку рыхтуе рэжысер Цялятнікаў.

Паведамленні

Менская гарадская камісія па чыстцы КП(б)Б 9 студзеня 1934 г. у 10 гадзін раніцы будзе разглядаць апеляцыі на рашэнне ячэйковых камісій ніжэйпамянёных таварышчоў:

Кошчэў Васілі Андрэеў — п-яч. Белгандля, Шапіра М. А. — БАН, Шубцік К. Л. — п-яч. дзіцячай клінікі, Конюхаў С. М. — завод «Комунар», Злобіч Г. Н., Рутковек Н. Г. — завод імя Варашылава, Сімановіч Антон Язэпаў — Белхарчпрамсаюз, Ільін Пётр Труша — завод імя Варашылава, Шэйдэль І. С. — завод «Большэвік», Нікалаеў Алесь — ВКСГШБ, Шыманчык Л. В. — фабрыка «Комунарка», Вензель Л. М. — завод імя Молатава, Турацкі А. У. — скарнижная фабрыка «1 мая», Грументаль М. А., Янудаўскі Я. А., Захарэўскі — п-яч. дзіцячай клінікі.

Менская гарадская камісія па чыстцы КП(б)Б.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць тт. Дземідава Георгія Савіча, працаваўшага раней у Віцебску; Гарохава К. П., працаваўшага раней ва Ўраравіцкім раёне; Сухарскую М. Я., Дуброўскага Ц. А., Лашунова С. А., працаваўшых раней у Сіроцінскім раёне; Шыдлоўскага Ю. У., Чубакова А. Л., Смарковіча, Кудрыцкага М. І., Каваленка А. І., працаваўшых раней у Гомельскім раёне; Кавалёва Г. П., працаваўшага раней у Терахаўскім раёне, Дзімітрашкіна Н. Д., працаваўшага раней у Рэчыцкім раёне; Гайдука А. П., працаваўшага раней у Крупскім раёне і Шуйскага В. Ф., працаваўшага раней у Дрысенскім раёне, паведаміць ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55) адрас месца работы і жыхарства без выезда ў Менск.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання паказаных таварышоў, паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АНОНС!

БЕЛДЗЯРЖКІНО ПРЭМ'ЕРА!

ВЫПУСКАЕ НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ да XV З'ЕЗДА КП(б)Б

ДВОЙЧЫ НАРОДЖАНЫ

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!

9-га СТУДЗЕНЯ ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Гарсовета, (пакой 32) АДБУДЗЕЦЦА

АГУЛЬНЫ СХОД чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан.

Прысутнасць усіх чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан абавязкова.

Гарадская партыйная камісія.

ПАМЯШКАННЕ ПОЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА

З 7 студзеня

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖТЭАТР „ЮНАГА ГЛЕДАЧА"

пачаў сезон.

У рэпертуары тэатра пастаноўкі „НАШ" —Знына, муз. Рабуновага „ШЛЯХ ДАЛЁКІ" —Шестакова, муз. Іванова „ВІНТОЎКА" —Крона, муз. Рабуновага.

У пастаноўцы мастацкага кіраўніка „ТЮГ'а" —Н. Навязіка.

з 7-1. па 15-1. спектаклі праданы. Надалей дырэкцыя прымае заявы.

Менск, Совецкая, 29, Польтэатр, тэл. № 21812.

Дырэкцыя.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ"

СЁННЯ і ШТОДЗЕННА

мастацкі кіно-раман у 2-х серыях і 0 частках

УКРАЗІЯ

(Батлец)

1-ая серыя ў 10 частках.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: Напоў, Солтыкоў і Зеркалава.

Пачатак сеанса 5, 7, 9, 11.

Каса адкрыта з 4 гадзін.

Кіно „СПАРТАК"

Сёння і штодзенна

дэманструецца выдатны фільм

ДЗЕВЯТАЕ СТУДЗЕНЯ

драма ў 10 частках.

Штодзенна 4 сеансы.

Каса—з 4 гадзін дня.

Па ініцыятыве рабочых заводаў імя ВАРАШЫЛАВА, „КОМУНАР", Бел. Акадэміі Навук і Дома Асветы

СЁННЯ, 8-га студзеня ў 8 гадз. веч., у памяшканні Дома Комасветы (вялікі зал) арганізуецца СУСТРЭЧА ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ МЕНСКІХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ з навуковымі працаўнікамі даследчых устаноў, інжынерна-тэхнічным персаналам г. Менска і настаўніцтвам масавых школ гор. Менска.

Усім вышэйпералічаным прадпрыемствам і ўстановам білеты можна атрымаць у Канц. Дома Комасветы і Акадэміі навук.

Персанально запрашаюцца ўсе рэдактары газет г. Менска.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб задачах ударнікаў і навуковых працаўнікоў у сувязі з надыходзячым XV-м з'ездам КП(б)Б і XVII-м з'ездам ВКП(б).

2. Вялікая мастацкая частка.

Арганізац. Камісія.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад 7 студзеня

СОВЕЦКІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ вытворчасці Дзяржкінпрамгрузіі

У ГАЛОЎН. РОЛІ НАТА ВАЧНАДЗЕ

СПРАВА ТАРЫЗЛЯ МКЛАВАДЗЕ

(забойства князя МКЛАВАДЗЕ).

У праграме: (гукавы фільм у 1 частцы) Маленькае апавяданне аб вялікім мыльным пузыры (Палітшарж на лейпцыгскі працэс).

Пачатак сеансаў у 6, 7-30, 9 і 10-30. КАСА адкрыта у 1 г. дня.

У ФАЙЕ ПЕРАД КОЖНЫМ СЕАНСАМ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ Ігар Южын

ЗУСІМ НОВЫ РЭПЕРТУАР М. В. НАДЗІНСКАЯ Руск. народн. спевы ГАРЫ = жавялёр.

ПАЧАТАК КАНЦЭРТАЎ: 5-30, 6-45, 8-15, 9-45.

Спазніўшыяся на сеансы не дапушчаюцца.

КАНТРОЛЬНА-РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ БЕЛКААПСАЮЗА просіць УСЕ СКАРГІ на няправільныя дзеянні апарата і асобных работнікаў БЕЛКААПСАЮЗА, яго аб'яднанняў і міжраённых баз прад'яўляць непасрэдна ў вуснай форме, або накіроўваць пісьмова па адрасу: Менск, Совецкая, 43-13, Кантрольна-рэвізійнай камісіі.

КРК БКСаюза.

Сектар па замежных справах ЦК т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖА БССР РАСШУКВАЕ родзічаў ніжэй пералічаных асоб, якім належыць атрымаць спадчыну і розныя віды грашовых узнагарод.

ПАШУКАЙ СВАЙГО РОДЗІЧА Ў ГЭТЫМ СПІСУ.

Калі ты яго знойдзеш пішы аб гэтым зараз-жа ў ЦК т-ва Чырвонага Крыжа БССР—замежны сектар г. Менск, Першамайская, 7.

УВАГА! Трэба мець на ўвазе, што прозвішчы і імёны пры перакладзе з англійскай на рускую мову могуць быць перабалтанымі.

БЕНДЭР Якаў. БЕНСОН Іван. БЕНКОВІЧ Ісаак. БЕОБІТ Міхаіл. БЕРГЕР Іосіф. БЕРГ Іосіф. БЕРГ Абрам. БЕРГ Юліус. БЕРЗНОКАС Пётр. БЕРКОВІЧ Ісідар. БЕРЗАНСКІ Іосіф. БЕРЗОН Ісідар. БЕРЫНСК Бруно. БЕРНШТЭЙН Іван. БЕРКОВІЧ Беніямін. БЕРКОВІЧ Юлі. БЕРЛІН Саламон. БЕРМАН Беніямін. БЕРМАН Іоміф. БЕРМАН Лестар. БЕРМАН Дзюдовіч. БЕРМАН Франк. БЕРНБАУМ Герман. БЕРНШТЭЙН Боня. БЕРНШТЭЙН Карл. БЕРНШТЭЙН Максім. БЕРНШТЭЙН Філіп. БЕРШАД Вільям. БЕШЭНКА Нікалай. БІАС Натан. БІККЕР Іван. БІЛЬЦЭЛЬСКІ Александр. БІНДЭР Адам. БІЖЭЛІК Марк. БІРМАН Меер. БІРНБАУМ Давід. БІРЭНЧУК Нікалай. БІРУКОЎ Мітрафан. БІСЛЕЙ Елізавета. БІЦ Вальтэр. БІШ Адам. БЛАНДЭР Гарры. БЛАНДЭР Самуіл. БЛАСК Александр. БЛАШЭВІЧ Антон. БЛЕКМАН Беніямін. БЛЮМ Абрам. БЛЮМ Вільям. БЛУМЕН Давід. БЛЮШ Іван. БЛЮК Франк. БЛЯСКЕ Алекс. БЛЯХАЎ Сцяпан. БАГАЧОЎ Тімофей. БАГДАНОВІЧ Альфонс. БОЛЗІЕВІЧ Боляслаў. БОВАЛЬ Іван. ВАЗОН Пётр. БОЙКІС Нікалай. БОЙКА Васілій. БАЛІНСКІ Віктар БОЛЬЗЕЦ Іосіф. БОК Робер. БОТНІК Эдуард. БОЧЭНКА Фэлікс. БАЯРСКІ Антон Іосіф. БОХЛЬ Дзеніс. БОГДЭН Морыс. БРЭС Гейман.

БОРЗУК Мірон. БАРЫСЕВІЧ Осіп. БОРНШТЭЙН Беніямін. БАРОДЗІН Антон. БАРОДКО Леонці Пётр. БРАВЕР Лаў. БРАЗНОЎСКІ Казімір. БРАТМАН Людвіг. БРАЎДЭ Гарольд. БРЭЗНА Андрэй. БРЭЙМАН Эдуард. БРЭЙДГЕМ Алекс. БРЭНЕР Самуіл. БРЭНЕР Якаў. БРЭНЕЙШЭР Отто. БРЫКМАН Эдуард. БРЫСКМАН Саламон. БРЫТОН Людвіг. БРОГІС Станіслаў. БРОДЗІ Міхаіл. БРОДЗІ Абрам. БРОДЗІ Генрых. БРАДОЎСКІ Казімір. Бродскі Натан. БРОНУШ Філіп. БРОНШТЭЙН Лео. БРОНШТЭЙН. В. Брук Аляксандр. БРУЕЙ Лео. БУБРЫСКІ Фрыдрых. БУГАЛЬ Генрых. БУДМАН Якаў. БУЗІЛО Іван. БУКСЕР Беньямін. БУНІМОВІЧ Хайман. БУРГАРД Кассер. БУРДЗЮК Васіль. БУРД Якаў. БУРКА Васіль. БУРКІС Карл. БУРКЕВІЧ Вільям. БУРАК Самуіл. БУРНЕЙКО Іосіф. БУРНШТЭЙН Філіп. БУДКІН МАКС. БУТЛЕР Іван. БУТАЎ Рувім. БУШ Мейк. БЕК Карп. БЕК Іосіф. БРАГАМ'Я Луіс. БРУСКОЎСКІ Франк. БАБОВІЧ Чарліс. БАКЛАМСКІ Франк. БАЛАСКІ Вільям. БАЛІНСКІ Вільям. М. БАЛЬТОДОЗІС Вільям. БАНТКОЎСКІ Рох. БАРАН Барталамяй. БАРАН Іван (Джон). БАБОНАС Іосіф. БАРАНАНАСКАС Іван (Джон). БАРАНОЎСКІ Густаў. БАРАНОЎСКІ Іван (Джон) П. БАРАНОЎСКІ Станіслаў (Станлі). БАРАНОЎСКІ Антоні. БАРОНСКІ Зыгмунд. БАРБАШЭВІЧ Антоні. БАРНАБЕЙ Луіс. БАРНІТОЎСКІ Владзік. БАРОН Давід. БАНСКІ Міхаіл (Майк). БАРТАШЭВІЧ Франк. БАЗЫЛЮК Сцяпан (Стыў). БАЗЫЛЮК Калістрат. БІДОРФ Гільберт. БІРСТЭЛЬ Мендель. БЕЛАВІЧ Міхаіл. БЕЛЬДЗІЦКІ Раман. БЯЛЬКО Аляксандр. БІНЕВІЧ Тодар. БЕНІНК Марцін. БЕНО Станіслаў П. БЕРГЕР Владзіслаў. БЕРКОЎ Меер. БЕРКОЎСКІ Франк. БЕРНАРД Серафім. БЕСАНОВІЧ РОДА. БЯЛЬКО Іосіф (Джо). БІХНЕВІЧ Брунсн. БЯЛЯРСКІ Юлік (Юльян). БЕЛЬСКІ Тэофіл (Тэвель. Тімафей). БЕНІК Іосіф. БІЯКО Стэнлі (Сцяпан). БІРЛІРАКІС Гесф. БІРМАН Морыс. БІРЭНБАУМ Айрвіна. БІЦОЎСКІ Франк. БЛАШЫК Лаўзэнс (Лаўрэнці). БЛАШАК Вальтар. БЛАШКЕВІЧ Юльян (Юлік). БЛАЦ Эдуард. БЛІНБЕР Аляксандр. БЛОК Іосіф Г. БЛЮМБЕРГ Самуіл. БЛЮМЕР Генры. БЛЮМЕНШАЙН Чэстар А. БОКЕНГАУЕР Веньямін Ф. БОГАСІЯН Міхаіл (Майк). БОГДАН Віктар. БОГЕН Іосіф (Джо). БОКІНЗ Франк. БАРЧЫНСКІ Міхаіл. БАРЭЦ Кароль. БОРГАРС Бені М. БАРКОЎСКІ Людвіг. БОРНІК Іосіф. БАРОЎСКІ Раман (Борфскі). БАРАВІК Фёдар. БОРТОН Іван (Джон) Канстанцінавіч. БОСАЛАВАГ Іосіф М. БОВІН Каміль. БАЯРСКІ Антоні. БРЭНАН Міхаіл. БРЭНАН Якаў (Джэк). БРЭНАН Джліс М. БРЭНЕР Ошэр. БРЭСНІЯН Іван В. БРЫХТ Стэнлі Ф. БРОК (БРУК) Юліюс. БРАЙКОВІЧ Іван. БРАЗІНСКІ Іосіф. БРАЗОЎСКІ Вольтэр. БУБЛІЧ Гуго Г. БУДКЕВІЧ Казімір. БАТВІЛОВІЧ Стэнлі. БОЎЧЭК Францішак. БІСОСЛЫ Іван (Джон). БАБІЧ Міхаіл. БАРАСКАЎ Джо. БОРДНЕР Джон (ГУЛЬКО Павел). БУКОЎСКІ Стыў. БРУДЗІНСКІ Франк. БОМБЕР Стэнлі.

ВАВІЧ Абрам. ВАЙЛЕР Іосіф. ВАЙН Гарры. ВАЙНЕР Франц. ВАЙНТРОП Філіп. ВАНІЛЬ Морыц. ВАЙС Веніямін. ВАКСЛЕР Якаў. ВАКУЛЬСКІ Іван. ВАЛЬДМАН Гарры. ВАЛЕНТУКОНІС Іосіф. ВАЛЕНЧАНКА Іван. ВАЛЯШЧУК Дзімітры. ВАЛЬНЕР Іван. ВАРАКІС Іван. ВАРНЕЙ Сцяпан. ВАРНІКЕР Макс. ВАЖАЙКО Франц. ВАРКОТАС Лесь. ВАРЦЫМОВІС Станіслаў. ВАСК Карл. ВАСІЛЕЎСКІ Вальтар. ВАСІЛІСК Алекс. ВАСІЛІСК Сцяпан. ВАСЕРМАН Леў. ВАСТРУБ Лесн Гарры. ВАСЮК Ігнат. ВАТРОПКА Сцяпан. ВАХАНЮК Філіп. ВАХРАХ Абрам. ВЕДМАН Адольф. ВЕЙЛЕР Артур. ВЕЙНЕР Ісідар. ВЕЙНЕР Генрых. ВЕЙНЕР Морыс. ВЕЙНЕР Самуіл. ВЕЙНЕР Франк. ВЕЙНШТЭЙН Іосіф. ВЕЙС Готліб. ВЕЙС Натан. ВЕЙСБЕРГ Філіп. ВЯЛІЧКІН Якаў. ВЕЙНБЕРГ Генрых. ВЕРАС Элвін. ВЕРАМЕЙ Іван. ВЕРЭСКО Акім. ВЕРТ Міхаіл. ВЕЙС Сімон. ВЕСЯЛОВІЧ Пётр. ВІТАВІЦКІ Абрам. ВЕЙЦМАН Герман. ВЕЛІНІСКА Іосіф. ВІЛЬК Іосіф. ВІЛЬКЕВІЧ Антон. ВІЛОВІЧ Карп. ВІЛЬЯМ Оскар. ВІЗІ (ВЕЙС) Лео. ВІНЕР Ісідар. ВІНТЭРС Юлі. ВІНІЦКІ Карл. ВІНАГРАД Ізраіль. ВІНАКУР Генрых. ВІРАСТЭТ Антон. ВІСНАЎСКІ Казімір. ВІТАСІК Вільям. ВІТКОЎСКІ Фёдар. ВІШНЕЎСКІ Леон. ВІША БЕНЕДЗІКТ. ВЛАДЫКА Нік. ВОЗНІК Джон. ВОЗНІК Іосіф. ВАЙНОЎСКІ Аляксандр. ВОЙЧЫК Пётр. ВАЛЫНСКІ Гарры. ВАЛЫНСКІ Антоні. ВОЛОБВІЧ Ісак. ВОЛЬФОВІЧ Людвіг. ВОНОВЕР Іцка. ВОЖНЯК Станіслаў. ВАРОНІК Людвіг. ВОРОСОК Капіен. ВОРТЭНКО Якаў. ВАШЧЫЛА Іван. ВУНГ Джон. ВАНЕК Міхаіл. ВЕЛЛЕР Сідні. ВЕШНЕР Морыс. ВІЛІЧОЎСКІ Іосіф В. (ВІЛІХОЎСКІ). ВНОВОЎСКІ Іван (Джон). ВАЯВОДА Томас. ВАЛАНСКІ Генры. ВОЗНЯК ЯКАЎ. ВРАЙТ (Роберт (Робей). ВАРАКОМСКІ Тэафіль П. ВАСІЦКІ Іван (Джон). ВАСІЛАЎСКІ Стэнлі. ВУКОВІЧ Марко. ВАЧОВІЧ (ВАХОВІЧ) Іван (Джон). ВАЙТКУНАС Іван (Джон). ВАДЗЕЮЛА Іонас. ВАЛАСЕК Джон (ВОЛАШЭК Іван). ВОКЧАК Франк. ВАЛЬЧЭЎСКІ Іван (Джон). ВОЛЬДЭР Клярэнц О. ВАЛЕНДЗЯК Вольтэр. ВОЛЬКЕР Іван (Джон). ВАЛЬГАПОЛЬСКІ Кнарас. ВАРШАЎСКІ Сроль В. ВАСІЯК Фелікс Лявон. ВАСІЛЕЎСКІ Франк. ВАШКЕВІЧ Тоні. ВАЧЭЎСКІ Вольтэр. ВЕГЛІНСКІ Вольтэр. ВАЙНЕР Фрэд. ВАНГАЙМЕР Адольф. ВАЙСМАН Якаў (Джон). ВАЙС Марцін. ВАЙС Натан. ВЕРБІЦКІ Тэранц. ВЕСЕЛОЎСКІ Язэп. ВІДЗІСЛАЎСКІС Іосіф. ВІДЛЯНСКІ Георг Г. ВЫБ Арон З. ВІНЕЎСКІ Болеслаў. ВЕШЧЧЫНСКІ Казімір. ВЫШАМЕРСКІ Алекс. ВЫК Андрэй. ВЫК Чарлі. ВЫКОЎСКІ Казімір. ВІЛІЧКІ Вінцэнціс. ВІЛЬЯМС Георг Г. ВІНЕВІЧ Станіслаў. ВІНАГРАДСКІ Тэо. ВІРАНОВІЧ Вільям (Джон). ВІРГОЎСКІ Іосіф. ВІРОСТАК Франк. ВІЖАВАТЫ Чарлз. ВІТЫНСКІ Пётр. ВІТКОЎСКІ Боляслаў. ВІЖБІЦКІ Антон. ВІЖОЙН Антон. ВОЛЬФ Агарык К. Р. ВОЛІНСКІ Сол. ВАЛКОЎСКІ Іосіф. ВОЛЕНБЕРГ Сам. ВАЛЕТ Генры В. ВАСІЛЕЎСКІ Даніял. ВОЙТАК Антон. ВОЗНЯК Іван. ВРАЎЛОЎСКІ Бені. ВЫНІК Павел (ВІНІК). ВЫСОКІ Іван С. ВЫСОКІ Зыгмунд Вольтэр. ВАРОНА Іван. ВІСКЕЎСКІ Франк.

ГАБЕ